

ПРАВЫ СВАЕ ДЗЕЦІ ВЕДАЮЦЬ... **7**

У КОЖНАГА СВАЯ ДАРОГА ДА ХРАМА **13**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІПЕНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 141 (30275)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта**

*(падчас паездкі ў пацярпелыя раёны Магілёўшчыны)*:

*«Асобная падзяка грамадзянам, якія аказваюць дапамогу спецыялістам, у тым ліку ў расчыстцы дарог і прыбіранні дрэў. Пасля селектара ў Прэзідэнта паступае вялікая колькасць званкоў, у тым ліку ў Адміністрацыю. Людзі гатовы аказаць любую неабходную дапамогу, створаны адпаведныя штабы ўжо ў раёнах. Там, дзе трэба, мы гэтай дапамогай абавязкова скарыстаемся».*

## КОРАТКА

• **БУТБ дапаможа рэалізаваць патэнцыял узаемнага гандлю Беларусі і Татарстана.**



• Маладзёжныя экіпажы на ўборцы ўраджаю намалацілі больш як 116 тыс.т збожжа.

• **Больш за 3,2 тыс. куб.м драўніны нарыхтавалі ў лясгасах Гомельскай вобласці на пацярпелых пасля стыхіі ўчастках.**



• Аб'ём здабычы торфу арганізацыямі тарфяной галіны Мінэнерга ў гэтым сезоне, паводле апошніх даных, склаў 1 млн. 56 тыс. т.

ISSN 1990 — 763X

24141

9 771990 763008

У цэнтры ўвагі

# Стыхію адолеем талакой

**Жыхары Гомеля ў гэтыя выхадныя дні масава выйшлі на суботнік, каб дапамагчы ў ліквідацыі наступстваў урагана, які абрынуўся на рэгіён увечары 14 ліпеня.**

Больш за 10 тысяч гамяльчан — кіраўніцтва гарвыканкама, супрацоўнікі раённых адміністрацый горада, дэпутаты, работнікі прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый — дапамагалі наводзіць парадак ва ўсіх раёнах абласнога цэнтра. Да вялікага працоўнага дэсанта неабыякавых гамяльчан у парку Фестывальны Савецкага раёна Гомеля далучыўся **старшыня Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ.**

— Хачу выказаць словы падзякі кожнаму гамяльчаніну, усім кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый, якія адгукнуліся і адзінай сям'ёй, адзіным калектывам узяліся вырашаць тыя пытанні, якія звязаны з жыццядзейнасцю нашых грамадзян, — падкрэсліў Уладзімір Прывалаў. — На суботніку мы працягваем ліквідоўваць наступствы стыхіі. Задача адна — вывезці зламаныя і паваленыя дрэвы. Падлічана, што іх было пашкоджана і выкарчавана больш за дзве тысячы.

На суботнік выйшлі прадстаўнікі 170 прадпрыемстваў і арганізацый горада.

— Мы з калегамі не можам заставацца ўбаку. На суботнік на чале з гендырэктарам выйшлі больш за 30 чалавек, — распавяла **намеснік гендырэктара прадпрыемства «Мілкавіта» Алена ЛАПАВА.**

У Навабеліцкім раёне Гомеля наступствы ўрагану ўстаранялі дэпутаты Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў. Дэпутацкі корпус Гомеля працаваў паблізу зоны адпачынку «Пруды».

— Кожны на сваім месцы, у сілу сваіх магчымасцяў робіць уклад у агульную справу, — падзякавала за спагадлівасць і неабыякавасць у ліквідацыі наступстваў стыхіі **старшыня Гомельскага гарсавета дэпутатаў Алена АЛЕКСІНА.**

На раніцу панядзелка 22 ліпеня ва ўсіх населеных пунктах вобласці забяспечана падача электраэнергіі: на пастаяннай аснове або праз дызель-генератары. Да часовых крыніц энергазабеспячэння падключаны 61 населены пункт. Над ліквідацыяй наступстваў стыхіі працягваюць працаваць звыш 70 брыгад энергетыкаў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Фота БелТА.







По сутнасці справы

# КАШТОЎНЫЯ КАДРЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў чэрвені даручыў увесці дадатковыя матэрыяльныя стымулы для пенсіянераў, якія прадаўжаюць працаваць. Гэта сведчыць аб тым, што дзяржава зацікаўлена, каб кадры з вялікім вопытам работы і жаданнем прыносіць карысць грамадству, працягвалі быць занятымі ў беларускай эканоміцы.**

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый Сянько пабываў у кіраўніка дзяржавы з дакладам 19 чэрвеня. Па выніках сустрэчы ён расказаў, што для працуючых пенсіянераў на гэты момант устаноўлены індывідуальны каэфіцыент заробку 1,3 і звыш гэтага каэфіцыента пенсія не выплачвалася.

Такім чынам, чалавек можа мець індывідуальны каэфіцыент заробку 1,45, а, паводле заканадаўства, працягваючы працаваць, ён можа атрымліваць не больш за 1,3. У сувязі з гэтым была пастаўлена задача ўнесці нарматыўны акт, які дасць магчымасць пенсіянерам прадаўжаць працаваць, але ўжо на больш прывабных умовах. Індывідуальны каэфіцыент заробку — гэта паказчык таго, які заробак быў у чалавека адносна сярэдняга па краіне. Каб яго вызначыць, неабходна падзяліць атрыманую зарплату за месяц на паказчык сярэдняй зарплаты ў гэтым жа месяцы.

Чакаецца, што дадатковыя стымулы пенсіянеры, якія працуюць, змогуць атрымаць у трэцім квартале 2024 года. Карэспандэнты «Звязды» пазнаёміліся з людзьмі, якія ўваходзяць у залаты фонд працоўных калектываў.

СТАР. 4-5

Адпачынак

# СОНЦА, ЗЁЛКІ І ВАДА

### У беларускіх санаторыях трэнд на натуральнасць, а ў адпачывальнікаў — яшчэ і на дарагі камфорт

**Лета ў беларускіх санаторыях другі год запар праходзіць пад знакам устойлівага попыту — у гэты час яны цалкам запоўнены. У некаторых здраўніцах запаўняльнасць перавышае нават 100 %, прычым апошнім часам сфарміраваўся трэнд на санаторыі высокай цэнавай катэгорыі. Спецыялісты падвялі першыя вынікі летняга аздараўлення, а таксама расказалі, у чым прыцягальнасць такога віду адпачынку і дзякуючы якім складальнікам попыт у суседзяў на нашы санаторыі толькі расце.**

СТАР. 8

З першых вуснаў

# «ГАЛОЎНАЯ НАША МЭТА — ДЫВЕРСІФІКАЦЫЯ ЭКСПАРТУ»

## Якія задачы кіраўнік дзяржавы паставіў перад Мінпрамам

**Напрыканцы мінулага тыдня на ўзроўні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адбылася сур'ёзная размова, прысвечаная сельскай гаспадарцы. Новы працоўны тыдзень кіраўнік дзяржавы пачаў нарадай аб развіцці прамысловасці Беларусі. Як ён заўважыў, сельская гаспадарка і прамысловасць — узаемазвязаныя паміж сабой, найважнейшыя сферы для нашай дзяржавы.**



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што аб правядзенні гэтай нарады дамовіліся яшчэ ў канцы чэрвеня. Тады, прызначаючы Аляксандра Яфімава міністрам прамысловасці, Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць даклад аб сітуацыі ў галіне і на яго аснове паставіць новаму міністру новыя задачы, акрэсліць перспектывы. Даклад Мінпрам падрыхтаваў, але, паколькі тэма найважнейшая, блок пытанняў пашырылі, а на размову запрасілі ўсіх, хто адказвае за развіццё айчыннай прамысловасці.

### Мы ўсё ўмеем рабіць. Галоўнае — прадаць

«Мяркуючы па той інфармацыі, якая ў мяне на стале, сітуацыя ў цэлым складаецца нядрэнна. Некалькі гадоў стабільна растуць аб'ёмы вытворчасці. Летась галіна выдала рэкордны за апошнія дзесяцігоддзе экспарт — 6,5 мільярда долараў. Аднак гэта зусім не нагода для таго, каб спачываць на лаўрах і думаць, што мы ўжо ўсё зрабілі. Расслабляцца ні ў якім разе нельга», — адзначыў Прэзідэнт.

«Галоўная наша мэта — дыверсіфікацыя экспарту. Мы ўсё ўмеем рабіць. Але галоўнае — прадаць. Попыт на нашу прадукцыю ёсць. Дзяржавы, гатовыя купляць нашу прадукцыю, таксама маюцца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт акрэсліў, з якімі краінамі могуць і павінны працаваць беларускія вытворцы. Асноўныя гандлёвыя партнёры Беларусі — Кітай і Расія. «Гэта традыцыйныя нашы партнёры, гэта наш якар, мы замацаваліся. І калі нехта думае: «вось, мы сыдзем з Кітая і Расіі і заўтра нас прымуць з распасцёртымі рукамі — глупства поўнае». Так, мы невялікая эканоміка, экспартная. Але трэба разумець, што гэта мільярды долараў. Канкурэнцыя сур'ёзная, і з нашымі таварамі нас ніхто нідзе асабліва не чакае. Таму Расія і Кітай, асабліва Расія — гэта наш традыцыйны рынак. Эканоміка — тут нікуды не падзенешся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што паспяхова развіваюцца адносіны з сяброўскімі краінамі. Нягледзячы ні на што, не губляюцца кантакты з краінамі Еўрапейскага саюза. «Як бы палітыкі ні спрабавалі ўзвесці бар'еры, калі эканомікі, бізнесу нешта трэба, яны знойдуць шляхі прабіцца на тыя ці іншыя рынкі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва з краінамі далёкай дугі: Азіі, Афрыкі, Паўднёвай і Лацінскай Амерыкі.

«За Афрыкай будучыня. Хто можа гэта аспрэчыць? Ніхто. Так, ёсць праблемы, ёсць складанасці. Але мы сёння маем прапрацаваныя добрыя кантакты», — сказаў беларускі лідар. У прыклад ён прывёў Зімбабвэ і Мазамбік, краіны на поўдні Афрыкі, надзвычай зацікаўленыя ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю. Калі ўзяць заходняе ўзбярэжжа афрыканскага кантынента, тут перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва з Нігерыяй, з суседняй з ёй Экватарыяльнай Гвінеяй. На поўначы Афрыкі ў Беларусі традыцыйна добрыя адносіны з Егіптам, Алжырам.

Кажучы пра Блізкі Усход, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што магчымасці Беларусі добра ведаюць і ў Ізраілі, выдатныя адносіны з Сірыяй і іншымі краінамі. Прэзідэнт нагадаў, што на палях саміту ШАС у Астане, сустракаўся з кіраўніцтвам Пакістана, там, па яго словах, таксама чакаюць беларускіх партнёраў. «Спрабуем зараз аднавіць нашы адносіны з Індыяй: усё ідзе нармальна», — дадаў ён.

Аднавіліся гандлёва-эканамічныя сувязі і з краінамі Лацінскай Амерыкі. Аляксандр Лукашэнка ўзгадаў нядаўнюю паездку ўрадавай дэлегацыі на чале з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам у Венесуэлу, Нікарагуа і Кубу: «Стаўленне да нас там нядрэннае. Гэта найбагацейшыя краіны, без іх Злучаныя Штаты Амерыкі не абыдуцца. Таму яны пачынаюць выбудоўваць адносіны з Венесуэлай. Гэта для нас добра». Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, трэба быць больш актыўнымі і ў Бразіліі. «Вялізная краіна (звыш двухсот мільёнаў чалавек), уплывовая ў палітычных адносінах, і ім трэба тое, што мы хочам прадаць», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў беларускай прамысловасці ёсць інтарэс і магчымасці быць прадстаўленай не толькі ў Расіі ці Кітаі, але і па ўсім перыметры дальняй дугі. Па яго словах, да гэтага працэсу будуць падключацца і іншыя краіны. «Уступленне Беларусі ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва адкрывае ўнікальныя магчымасці па прасоўванні прамысловай прадукцыі ў краіны ШАС. Трэба шырока развіваць і гэты кірунак», — сказаў Прэзідэнт.

Беларускі лідар зрабіў акцэнт на тым, што акрамя паставак тэхнікі, трэба засяродзіцца на стварэнні сэрвісных цэнтраў у краінах, якія купляюць беларускую прадукцыю. «Навучанне, сэрвісныя цэнтры, лакалізацыя ў стварэнні ўласных вытворчасцяў — гэта ўнікальная магчымасць прыйсці ў далёкія рэгіёны сур'ёзна і надоўга», — растлумачыў ён.

### Моцная эканоміка — гэта незалежная дзяржава

Разам з тым, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нельга забываць пра ўнутраны рынак. І рабіць гэта, па яго словах, трэба разумна. Прэзідэнт не лічыць абсалютную абарону ўнутранага рынку ад імпарту магчымым варыянтам, паколькі ў адказ іншыя краіны закрыюць свае рынкі для айчыннай прадукцыі. «Такі наш лёс, што ў нас вырабляецца ўсё тое, што ў свеце вырабляюць у вялікай колькасці. Таму проста так абараняць свой рынак, зачыніцца на мяжы і нікога не пусціць не атрымаецца. Трэба дзейнічаць разумна. Для гэтага ў нас ёсць урад, каб дапамагаў прамысловым прадпрыемствам працаваць», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што неабходна і больш актыўна адстойваць інтарэсы Беларусі ў рамках дасягнутых з Беларуссю дамоўленасцяў. Ён заўважыў, што цяпер беларускія прадпрыемствы страчваюць расійскі рынак па некаторых традыцыйных беларускіх таварах — трактарах, халадзільніках. Хаця ў частцы продажаў халадзільнікаў сітуацыя пачынае выпраўляцца і намеціліся станоўчыя тэндэнцыі. Па словах беларускага лідара, гэтым неабходна карыстацца.

«Нягледзячы на вытворчасць шырокай лінейкі айчыннай тэхнікі, да гэтага часу закупляем імпартныя аналагі. І прытым там, дзе мы не павінны закупаць. Чаму гэта адбываецца? Саступаем па цане? Недацягваем па якасці? Не выбудавалі маркетынгавую палітыку?», — акрэсліў праблему Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўзняў яшчэ шэраг пытанняў, на якія хацеў бы пачуць адказы ад адказных за прамысловасць. Якія канкрэтныя меры прыняты па абароне ўнутранага рынку? «Што зроблена? І галоўнае — калі будзе вынік? Гэта галоўнае, — сказаў ён. — А вынік у тым, каб прадпрыемствы працавалі і былі грошы».

Яшчэ адно праблемнае пытанне звязана з вяртаннем знешняй пратэрмінаванай дэбіторскай запазычанасці, якая, як і ў мінулым годзе, працягвае расці. «Хачу ўсіх дырэктараў папярэдзіць: гэта — турма, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Яшчэ і таму, што пры такім раскладзе вы просіце танныя крэдыты пад «абаротку» і рэструктурызацыю даўгоў. То-бок спадзяецеся, што дзяржава са сваёй кішэні вам дасць на чарговыя льготы і прэферэнцыі. У чарговы раз паўтараю: павінна быць цвёрдая дысцыпліна разлікаў».

«Запуск новага інвестыцыйнага цыклу ў кантэксце задач па імпартазамяшчэнні і лакалізацыі павінен забяспечыць наш тэхналагічны суверэнітэт і гарантаваць устойлівае развіццё. Таму што моцная эканоміка — гэта незалежная дзяржава», — падсумаваў беларускі лідар. Ён пацікавіўся, на якім этапе цяпер рэалізацыя імпартазамяшчальных інвестыцыйных праектаў, што фінансуюцца з удзелам сродкаў дзяржаўнага фінансавага крэдыту Расійскай Федэрацыі. Аляксандр Лукашэнка спытаў, як выконваецца даручэнне аб арганізацыі сэрвісных цэнтраў беларускай тэхнікі ва ўсіх расійскіх рэгіёнах, куды яна пастаўляецца? Ён папрасіў расказаць, як у цэлым выбудавана работа па забеспячэнні якасці прадукцыі, якая выпускаецца.

### Мінпраму ўдалося выканаць усе паказчыкі бягучай пяцігодкі

Міністр прамысловасці Аляксандр Яфімаў далажыў аб асноўных кірунках развіцця беларускай прамысловасці, асноўных праблемах і шляхах іх вырашэння. Па словах міністра, па працягу апошніх гадоў галіна штогод выконвае ўсе ключавыя паказчыкі эфектыўнасці, якія даводзяцца. Так, з 2021 па 2023 гады, нягледзячы на ўзрастаючыя спробы знешняга ціску з боку недружалюбных краін, рост прамысловай вытворчасці склаўся на ўзроўні 139,8 працэнта пры арыенціры 124,6 працэнта, па экспарце — 168,1 працэнта пры арыенціры 136,3 працэнта. Забяспечваецца ўстойлівая работа прамысловасці. У 2023 годзе экспарт склаў 6,5 млрд долараў — рэкордная лічба за апошнія 10 гадоў. Аляксандр Яфімаў падкрэсліў, што сёлета Мінпрам плануе забяспечыць таксама станоўчы тэмп росту экспарту, тым самым паўтарыўшы ўжо дасягнуты рэкорд.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

У тэму

## Інвестыцыі, інавацыі, імпартазамяшчэнне

Размаўляючы з журналістамі, **міністр прамысловасці Аляксандр ЯФІМАЎ** адзначыў, што далей галіна будзе развівацца па трох «І» — інвестыцыі, інавацыі, імпартазамяшчэнне. Дзякуючы гэтым кампанентам, плануецца ў бліжэйшыя гады істотна пашырыць лінейку прадукцыі — да 2030 года павінны з'явіцца больш як 2 тысячы новых відаў тавараў. Будуць узрастаць інвестыцыі ў навуку і вытворчасць. У 2024-м яны павінны павялічыцца на 30 працэнтаў да ўзроўню 2023-га (за гэты перыяд яны, дарэчы, былі даволі значнымі: у мінулым годзе яны склалі столькі ж, колькі ў 2021 і 2022 гадах разам узятых), і гэты тэмп плануецца захаваць да 2030 года.

Па словах міністра, айчынная прамысловасць апошнія гады дэманструе станоўчыя вынікі работы. «Але разам з тым ёсць куды расці і ёсць праблемы на пэўных прадпрыемствах, якія трэба вырашаць», — адзначыў ён. Усе гэтыя праблемы абмяркоўваліся на нарадзе ў Прэзідэнта, і як расказаў Аляксандр Яфімаў, ключавыя рашэнні па іх прынятыя.

Што датычыцца дыверсіфакацыі экспарту, якую кіраўнік дзяржавы назваў галоўнай мэтай, то супрацоўніцтва з ключавымі партнёрамі Расіяй і Кітаем, па словах Аляксандра Яфімава, будзе паглыбляцца. «З Расіяй — у рамках адзінай прамысловай палітыкі, з Кітаем — у рамках дэталізаванага плана па спалучэнні прамысловых палітык, які прадугледжаны комплекснай стратэгіяй сумеснага прамысловага развіцця. З гэтымі дзвюма краінамі мы працягнем гандлёвыя, эканамічныя, тэхналагічныя і тэхнічныя адносіны», — растлумачыў ён.

**Генеральны дырэктар ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» Валерый ІВАНКОВІЧ** адзначыў, што ўсе ключавыя паказчыкі на паўгоддзе прадпрыемствам выкананы. «На сёння мы маем па Расійскай Федэрацыі ў прапрацоўцы кантракты па грузавой тэхніцы, маем прапановы па пасажырскай тэхніцы. Я літаральна толькі што вярнуўся з камандзіроўкі з Нікарагуа, дзе намі падпісаны кантракт, сфарміраваны новы пункт экспартнага росту і патэнцыяльнага гандлю ў краінах Лацінскай Амерыкі», — расказаў ён. Ідзе праца і над развіццём сэрвіснага абслугоўвання за мяжой. Па словах Валерыя Іванковіча, МАЗ рэалізуе цэлую праграму па гэтым кірунку ва ўсіх пунктах, дзе прадае тэхніку.

«Па сегменце грузавой тэхнікі цяпер адчуваецца сур'ёзны націск на рынку з боку кітайскіх канкурэнтаў. Мы адчуваем націск як па цэнавых параметрах, так і па тэхнічным аснашчэнні. Кітайскія вытворцы вельмі шмат зрабілі для павышэння якасці сваёй тэхнікі», — расказаў Валерый Іванковіч. Ён таксама заўважыў, што на расійскім рынку традыцыйна прысутнічаюць уласныя маркі грузавой тэхнікі, што дадаткова ўзмацняе канкурэнцыю. «Што датычыцца пасажырскай тэхнікі, то на цяперашні момант мы зробім упор на рэалізацыю і выкананне ўсіх беларускіх праграм. У тых рэгіёнах, з якімі мы працавалі і якія пастаўлялі тэхніку, мы прысутнічаем і працуем. На сёння ў прапрацоўцы дамоўленасці па рэалізацыі аўтобуснай, тралейбуснай тэматыкі. «Уфімскі трамвайна-тралейбусны завод», з якім мы разам рэалізуем інавацыйны праект у Расійскай Федэрацыі», — распавёў гендырэктар МАЗ.

**Генеральны дырэктар ААТ «Кіруючая кампанія холдынгу «Бабруйскаграмаш» Алег КОРСАК** расказаў, што абстаноўка на прадпрыемстве стабілізуецца, нарошчваюцца экспартныя пастаўкі. «На сёння ў нас ёсць усё для таго, каб завяршыць год з тэмпам росту не менш за 105 %. Таму развіваемся далей. Мы шчыльна працуем над тымі задачамі, якія стаялі па якасці. У тым ліку — над стварэннем новых відаў тэхнікі: у рамках тых кампетэнцый, якія ўжо створаны на прадпрыемстве, гэта, вядома, корманарыхтоўчая тэхніка, велікагрузныя прычэпы, якія дадуць магчымасць больш эфектыўна загрузіць машынна-трактарны парк у АПК», — распавёў Алег Корсак.

Ён заўважыў, што санкцыі падштурхнулі холдынг да развіцця. Больш сур'ёзная ўвага стала ўдзяляцца імпартазамяшчэнню, лакалізацыі вытворчасці.

З нагоды

# Толькі разам, і толькі наперад!

## У Мінску прайшоў Форум патрыятычных сіл

**Адбыўся ён у сталічным Палацы спорту і быў прымеркаваны да 30-годдзя ўстанаўлення інстытута прэзідэнцтва. Акурат 20 ліпеня 1994 года першы выбраны Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў прысягу і заступіў на пасаду кіраўніка дзяржавы. Пляцоўка для правядзення форуму таксама была выбрана невыпадкова: менавіта тут у 1996 годзе праходзілі пасяджэнні першага Усебеларускага народнага сходу, які ў многім быў лёсавызначальным для краіны. Гэтым разам у рабоце форуму ўзялі ўдзел прадстаўнікі вядучых грамадскіх арганізацый і партыйных структур дзяржавы з усіх рэгіёнаў краіны. Настрой у зале сведчыў: тут сабраліся аднадумцы. Ды і само мерапрыемства здавалася не столькі афіцыйна-дзелавым, колькі святочным: песні, танцы, музыка, усмешкі, яркія эмоцыі... І шчырыя словы, не з высокай трыбуны, а проста са сцэны, якія знаходзілі водгук на танцполе і ў запоўненай зале.**

### «Разам справімся з выклікамі і пагрозамі»

«Мы разам з нашым Прэзідэнтам гатовыя адстойваць інтарэсы, суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь, — сказаў **грамадскі дзеяч, заснавальнік дабрачыннага фонду, матывацыйны спікер, член нацыянальнай паралімпійскай зборнай, шматразовы рэкардсмен свету і Еўропы па плаванні Аляксей ТАЛАЙ.** — Разам, як адзін, ведаючы і разумеючы, адчуваючы сваю адказнасць за лёс нашай краіны, лёс нашых дзяцей, унукаў, дзядоў і прадзедаў, якія нябачна з намі, мы абавязкова справімся з усімі выклікамі і пагрозамі знешняга свету і абавязкова атрымаем поспех, таму што ў Беларусі моцны лідар — наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка».

### «У нас сапраўдны суверэнітэт»

«Самае галоўнае, каб усе разумелі: пасля распаду СССР калектыўны Захад не хацеў, каб было 15 моцных, незалежных рэспублік, — адзначыў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** — Ім патрэбна была Расія, раздзеленая на часткі, і патрэбна была Беларусь і іншыя вакол Расіі краіны — слабыя, нікчэмныя і, пажадана, антырасійскія, каб ператварыць іх у плацдарм для вайны. Мы бачым, якператварылі людзі Прыбалтыку і Украіну. Наш Прэзідэнт выратаваў Беларусь ад гэтага сцэнарыя. Ён зрабіў так, каб у нас з'явіўся сапраўдны суверэнітэт. У 1991 годзе дэпутаты Вярхоўнага Савета абвясцілі суверэнітэт, але па факце яго не было. Таму самае галоўнае дасягненне — гэта тое, што мы жывём у суверэннай і незалежнай дзяржаве. З гэтага вынікае ўсё астатняе: і эканамічныя поспехі, і палітычныя, і мірнае неба над галавой. Без суверэнітэту нічога гэтага не будзе. І мы хочам паказаць, што насуперак жаданню ворагаў нас пасварыць, раздзяліць, мы ўсё роўна будзем разам стаяць побач з кіраўніком дзяржавы, таму што яго выбраў народ».

### Маладосць на маршы

«30 гадоў таму Прэзідэнт не проста выратаваў краіну, а зрабіў яе касмічнай дзяржавай, арыентаваўшы моладзь на падтрымку, развіццё і адказнасць, — сказаў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.** — Сёння пад дахам Палаца спорту сабраліся тысячы маладых людзей, якія сталі дзецьмі нашага Прэзідэнта ў плане выхавання, у плане стаўлення да дзяржавы. Вельмі важна, што БРСМ і ў цэлым маладзёжная палітыка будуецца на базе пераемнасці ў лепшых традыцыях камсамольскага руху».

Па яго словах, наша маладзёжная палітыка стала сапраўдным ўзорам для іншых. Сёння яна прызнаная ў многіх краінах. «Сёлета БРСМ уступіў у Маладзёжны савет ШАС — самую магутную маладзёжную структуру на міжнароднай прасторы. Гэта і ёсць прызнанне той сацыяльна арыентаванай палітыкі. Маладыя людзі сёння актыўна ўключыліся ва ўборку мясцовасці, ліквідуючы наступствы стыхіі. Яны працуюць на тых тэрыторыях, якія маюць патрэбу ў падтрымцы, не чакаючы, калі іх паклічуць або прыцягнуць, яны ідуць самі. Гэта і ёсць вялікая самасвядомасць не толькі маладых людзей, а і ўсяго нашага грамадства», — дадаў ён.

### Мы, беларусы, ёсць і будзем

«Быць беларусам, жыць і працаваць на сваёй зямлі, пад сваім сцягам, гербам, пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта — гэта гонар, — падкрэсліў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН.** — Па ўсёй зале сёння лунаюць беларускія дзяржаўныя сцягі — матэрыяльнае сведчанне нашай прыналежнасці да гордага і вольнага народа. На працягу ўсёй гісторыі нам спрабавалі адмаўляць у праве «людзьмі звацца». Але нашы продкі змагаліся і перамагалі. І здзейснілася мара: мы занялі «свой пачэсны пасад». У нас ёсць свая дзяржава, свой сцяг, свой Прэзідэнт!»

Ён прапанаваў паглядзець на беларускі герб. «Сонечны, з кветкамі лёну і канюшыны. У ім мы бачым абрысы сучасных дасягненняў. У палях і заводскіх цэхах, навуковых лабараторыях, тэатрах і бібліятэках, на спартыўных арэнах. Быць беларусам, жыць і працаваць на сваёй зямлі, пад сваім сцягам, гербам, пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта — гэта гонар. І ўсе мы разам сведчым: мы ёсць і мы будзем. Мы — беларусы!» — падагульніў Вадзім Гігін.



Фота БелТА.

### Нашы каштоўнасці — Радзіма, сям'я, вера, праца і справядлівасць

«Улада павінна быць моцнай, цэнтралізаванай і жорсткай. Гэта неабходна, таму што наша краіна знаходзілася і знаходзіцца ў неспрыяльным знешнім асяроддзі. Яна павінна быць выразна сканцэнтраваная ў руках чалавека, які нясе паўнату адказнасці за свой народ, за сваю краіну, за сваю дзяржаву. Наш Прэзідэнт нясе гэту адказнасць, і нясе яе з годнасцю і гонарам, — сказаў **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ.** — Наша краіна стаіць на надзейным гістарычным падмурку. Беларусь зрабіла правільны светапоглядны выбар і ўвасобіла яго і ў сваёй Канстытуцыі, і ў сваёй ідэалогіі. Мы грунтуемся на традыцыйных каштоўнасцях. Мы стаім на надзейных кансерватыўных сэнсах і каштоўнасцях нашай гісторыі, на тым, на чым сталі і развіваліся беларусы. Гэта Радзіма, гэта сям'я, гэта вера, гэта праца, гэта справядлівасць. Менавіта на гэтай аснове мы развіваемся і дасягнем яшчэ больших поспехаў, яшчэ больших вынікаў».

### Падвядзенне вынікаў і даніна павагі

«30 гадоў таму, калі прысутнічала на інаўгурацыі Прэзідэнта, мне ў галаву не прыходзіла, што праз такі час я буду ў ліку ўдзельнікаў, прысутных на мерапрыемстве з нагоды 30-годдзя яго палітычнага жыцця,— падзялілася **дзяржаўны дзеяч, экс-старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.** — Гэтае мерапрыемства вельмі знакавае. Гэта не толькі падвядзенне вынікаў, але і даніна павагі нашаму лідару, які з краіны з пераважнай беднасцю і галечай змог стварыць квітнеючую, паспяховую дзяржаву са стабільным насельніцтвам. Думаю, гэта выдатны вынік. Я магу толькі пажадаць кожнаму палітычнаму лідару прыйсці да такога выніку. Сёння — дзень ацэнкі таго, што зроблена, а зроблена — грандыёзна шмат».

### «З народам і для народа»

«Многія добра памятаюць дзевяностыя гады, памятаюць, у якім стане была эканоміка, памятаюць, як многія прадпрыемствы знаходзіліся на мяжы закрыцця, як мільёны жыхароў нашай краіны не ведалі, будуць яны заўтра працаваць ці не. І менавіта наш Прэзідэнт стаў на абарону інтарэсаў чалавека працы. У сваёй першай перадвыбарнай праграме ён адзначыў, што галоўным у яго палітыцы будзе чалавек працы. І крок за крокам Прэзідэнт пабудаваў дзяржаву, у якой інтарэсы чалавека працы стаяць на першым месцы, — заявіў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО.** — Сёння ўсе рашэнні ў нашай краіне ў сферы працоўных сацыяльных адносін прымаюцца з удзелам прафсаюзаў, з улікам меркавання народа. Мы ведаем, што Беларусь, наш курс развіцця і мадэль краіны не раз спрабавалі зламаць, прымусіць нас адмовіцца ад сацыяльнай падтрымкі людзей, спыніць прадпрыемствы, разбурыць працоўныя калектывы. У нашых апанентаў гэта не атрымалася і не атрымаецца! Таму што наш Прэзідэнт заўсёды быў і будзе разам з народам і для народа!» — падагульніў ён.

### «Сіла, якая вызначае нацыю»

«Сёння, як некалі вялікі Савецкі Саюз, для многіх у свеце мы з'яўляемся арыенцірам прагрэсу і барацьбы за справядлівы светапарадак супраць імперыялізму, неакаланіялізму і фашызму. Мы захавалі найлепшыя савецкія традыцыі, не адмовіліся ад ідэалаў сацыяльнай справядлівасці, народаўладдзя і дружбы народаў, — адзначыў **першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей СЫРАНКОЎ.** — Менавіта дзякуючы нашаму народнаму Прэзідэнту ў Беларусі ўлада народа, а не ўлада алігархату ці знешняга капіталу. Мы ведаем стаўленне кіраўніка дзяржавы да ліберальна-рынкавых механізмаў, якія загубілі ўжо не адну краіну. Выступаючы перад удзельнікамі 7-га Усебеларускага народнага сходу, ён сказаў, што мы захавалі найлепшыя савецкія традыцыі, але дапоўнілі іх сучаснымі, якія адпавядаюць часу і духу нашага народа. Гэта і ёсць наша сіла — сіла, якая вызначае нацыю. Час выбраў нас для стваральнай працы, развіцця і будучых перамог. І яны абавязкова будуць!»

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# Любімую не аддаюць!

**У Віцебску прайшоў патрыятычны форум, прысвечаны 30-годдзю інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне «Час выбраў нас. 30 гадоў пад знакам якасці». Ён аб'яднаў больш як шэсць тысяч чалавек з розных куткоў паўночнага рэгіёна.**



Фота «Витебские вести».

На форум, які адбыўся 20 ліпеня, аўтапрабегамі прыехалі дэлегацыі ўсіх раёнаў Віцебскай вобласці. Яны сабраліся ў трох пунктах: на плошчы Перамогі, плошчы Свабоды і плошчы Леніна. На плошчы Перамогі адбылася патрыятычная акцыя, у рамках якой навучэнцы ваеннай кафедры ВДУ імя П. Машэрава разгарнулі сцяг са слоганам «За Бацьку!». Пасля святочным шэсцем кіраўніцтва вобласці і горада, працоўныя калектывы, грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі з плошчы Свабоды накіраваліся да Летняга амфітэатра.

«Мы ўсе вельмі розныя, розных прафесій, адукацыі, з розных населеных пунктаў, але ўсіх нас аб'ядноўвае любоў да нашай зямлі, любоў да нашай краіны, любоў і павага да нашага Прэзідэнта. За гады развіцця былі ўзлёты і падзенні, больш ці менш паспяховыя праекты, але беларусы ўпэўнена і безапеляцыйна развіваюць сваю краіну. Гэтыя 30 гадоў мы прайшлі разам, 30 гадоў пад знакам якасці. Краіна прыгажэе, горад прыгажэе. Мы выбралі правільны шлях, прапанаваны Прэзідэнтам, якога выбраў беларускі народ», — звярнуўся да ўдзельнікаў форуму **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.**

«30 гадоў таму наш народ апынуўся на ростанях. Здабыўшы дзяржаўнасць пасля развалу Савецкага Саюза, мы павінны былі выбраць далейшы шлях свайго развіцця. На хвалі развалу СССР да ўлады прыйшлі адкрытыя прайдзісветы, якія спрабавалі падштурхнуць нас на шлях ашалелага нацыяналізму, варожасці са сваімі брацкімі народамі, сваімі суседзямі. Прадпрымаліся любыя ідэі, накіраваныя на раскол брацкіх славянскіх народаў, былі спробы адмовы ад рускай мовы. Куды вядзе гэты шлях, мы можам убачыць цяпер, азірнуўшыся на нашых заходніх і паўднёвых суседзяў. Мудрасць і воля народа прывялі да ўлады маладога, мужнага, сумленнага палітыка — Аляксандра Лукашэнку. Таго чалавека, які не пабаяўся ўзяць на сябе адказнасць за лёс нашай краіны. Ён вельмі добра ведаў і адчуваў нашу гісторыю, традыцыі, культуру. Дзякуючы Прэзідэнту сёння мы будуем свабодную, незалежную, квітнеючую краіну. Дзякуючы палітыцы захавання гісторыка-культурнай спадчыны, нашых духоўна-маральных каштоўнасцяў упэўнены: ні мы, ні нашы дзеці ніколі не станучь людзьмі без роду і племені, парабкамі на сваёй уласнай роднай зямлі. Мы дакладна ведаем: Беларусь — гэта наша краіна. Аляксандр Лукашэнка — наш Прэзідэнт, наш Бацька», — сказаў **кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ.**

На сцэне Летняга амфітэатра прайшоў маштабны канцэрт з удзелам найлепшых калектываў мастацкай самадзейнасці паўночнага рэгіёна. Віцебская вобласць павіншавала Аляксандра Рыгоравіча з 30-годдзем інстытута прэзідэнцтва і запісала відэавіншаванне.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Алегу Алегавічу РУМО, члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, дырэктару дзяржаўнай установы «Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантalогіі і гематалогіі», у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю ЦЕСЦЯ.**

# ТВОРЧАСЦЬ, ЯКАЯ

**З тым, што сапраўдны ўзрост у галаве, а не ў пашпарце, згодна загадчык Заронаўскага сельскага Дома культуры Віцебскага раёна Людміла Аляксеева. Ёй пашчасціла зрабіць хобі прафесіяй, таму нават на пенсіі яна штодзень ідзе на працу з радасцю.**

Нягледзячы на тое што ў дзяцінстве Люда заўсёды захаплялася мастацкай самадзейнасцю, пасля школы выбрала прафесію ветурача. «У мяне па жыцці былі і ёсць тры захапленні: творчасць, любоў да кветак і ўсіх жывёлін. Таму вырашыла вучыцца на ветэрынара. А мне, тады 18-гадовай дзяўчыне, гаварылі, што гэта ганебная прафесія, не жаноцкая. Але ж у адрозненне ад людзей жывёла не можа паскардзіцца, паказаць, дзе баліць», — успамінае гераіня.

Там, у Віцебскім ветэрынарным інстытуце (сёння — ВДАВМ), была моцна развіта мастацкая самадзейнасць. Дарэчы, гэтым установа вышэйшай адукацыі славіцца і сёння. У той час набіраўся новы састаў вакальна-інструментальнага ансамбля «Лянок», які потым стаў легендарным. На кастынг прыйшла і Людміла, паспяхова здала экзамены, стала выступаць у складзе хору, а потым атрымлівала і сольныя партыі. Калектыў стаў знакамітым не толькі ў Віцебскай вобласці, але і ў рэспубліцы, на прасторах СССР, нават за мяжой. ВІА шмат гастраляваў, выступаў перад працаўнікамі вёскі, у воінскіх часцях, на фабрыках і заводах. Цёпла прымалі віцебскіх артыстаў у Кіеве, Рызе, Каўнасе, Маскве і іншых гарадах. Аляксеева аддала тры гады служэнню мастацтву ў сценах ветэрынарнага інстытута, а пасля выйшла замуж і засталася ў Віцебскім раёне пісаць свой прафесійны летапіс.

Тры гады адпрацавала ветурачом у саўгасе «Віцебскі», потым займала пасаду начальніка вытворчага ўчастка, працавала ў эканамічнай службе сельскагаспадарчага прадпрыемства. Звыш 20 гадоў аддала рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі, потым у саўгасе пачалася рэарганізацыя, склалася нялёгкая эканамічная сітуацыя. Зарплаты плацілі з вялікімі затрымкамі, а трэба было карміць сям'ю, гадаваць дачок. Людміла ў той час трымала карову, а каб зарабіць капейчыну, вазіла ў руках па 18-20 літраў малака з вёскі на гарадскі рынак.

Каля сямі гадоў Людміла Рыгораўна аддала рабоце ў Пестуніцкай сельскай бібліятэцы, дзе таксама ўдзельнічала ў канцэртных праграмах мясцовага Дома культуры, які размяшчаўся з бібліятэкай у адным будынку. Пасля рэарганізацыі ўстановы, ужо на пенсіі Людміла Рыгораўна прыйшла на работу ў Заронаўскі сельскі Дом культуры, пачала працаваць мастацкім кіраўніком. Калегі прынялі ў свой калектыў з радасцю, напрацаваны за доўгія гады аўтарытэт і адметны голас зрабілі сваю справу. «Пачынаць было нескладана, клубы знаходзяцца ў адным сельсавеце, я ведала людзей і па грамадскай рабоце, з заронаўцамі мела зносіны і падчас работы ў саўгасе. Я прытрымліваюся ў жыцці правіла «стаўся да людзей так, як хочаш, каб яны ставіліся да цябе», таму ўваходзіць у культурны вясковы рух было няцяжка», — расказвае Людміла Аляксеева.



У 2020 годзе пасаду мастацкага кіраўніка перайменавалі ў культарганізатара, на працягу двух гадоў гераіня адказвала за пытанні вясковых культурных мерапрыемстваў абсалютна адна: звольніўся загадчык, не было кіраўнікоў гурткоў па інтарэсах. Адным словам, давялося адказваць за пажарную бяспеку, выкананне плана платных паслуг, арганізоўваць канцэрты да каляндарных свят і многае іншае. І гэта ўжо доўгі час будучы на пенсіі. «Часткова менавіта ў той перыяд я зразумела для сябе, што ўзрост — гэта той, што ў душы, а не ў пашпарце. У жніўні мне споўніцца 67, аднак ні фізічна, ні маральна я не адчуваю сваіх гадоў. Магчыма, галоўную ролю ў гэтым адыгрывае мая работа, на якую я кожны дзень іду з радасцю», — разважае гераіня.

Вопыт, мудрасць і, вядома, дзеці-выхаванцы дапамаглі пераадолець усе цяжкасці, якія не зламалі, а, наадварот, загартавалі. Пакрысе калектыў Дома культуры пачаў папаўняцца, з'явіўся малады культарганізатар, а Людміла Рыгораўна стала загадчыкам установы. Нядаўна на работу прыйшоў і новы кіраўнік гуртка па інтарэсах. Нягледзячы на тое што ўзрост павінен браць сваё, з камп'ютарам Аляксеева на «ты». «Насамрэч з надыходам лічбавізацыі працаваць стала значна лягчэй. Калі ад нас патрабуецца нейкі дакумент, я ў галаве адразу малюю схему, як яго скласці і дзе ён знаходзіцца ў камп'ютары», — адзначае яна.

Улічваючы тое, што цяпер у калектыве культурнай установы пераважае моладзь, праблема пакаленняў таксама не стаіць. «Я заўсёды прымаю ўсе новыя, свежыя ідэі, адкрытая для эксперыментаў, тым больш, што і сфера дзейнасці гэтага патрабуе. Бывае, што прыходзіцца папраўляць і накіроўваць з улікам вопыту і погляду збоку», — гаворыць гераіня.



# ВАЖНАЯ ЧАСТКА

## Некаторыя гродзенскія работнікі працуюць

**Сфера дзейнасці Алены Шабалоўскай і Уладзіміра Высоцкага вельмі розная. Жанчына працуе з жывёламі ў заапарку, а мужчына — слесар-электрамантажнік на вытворчым прадпрыемстве. Але, нягледзячы на такія розныя віды работ, у іх ёсць і агульнае — адданасць сваёй прафесіі. Такіх людзей без перабольшвання можна лічыць залатым кадравым фондам рэгіёна.**

### «ЗААПАРК — МОЙ ДРУГІ ДОМ»

У Алены Шабалоўскай усё жыццё звязана з жывёламі. Гродзенскі заапарк яна наведала маленькай дзяўчынкай, і з тае пары стала тут бываць пастаянна. Амаль кожны дзень хадзіла ў гурток юных натуралістаў, дапамагала работнікам заапарка карміць жывёл, а пасля школы і сама стала працаваць.

— Мае бацькі былі супраць таго, каб я ішла сюды на работу, яны абодва архітэктары і бачылі дачку ў больш прэстыжнай прафесіі. Трэба сказаць, што ў мяне былі здольнасці да малявання, але любоў да жывёл перамагла. Работу ў заапарку сумяшчала з вучобай на завочным аддзяленні Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта на заааінжынерным факультэце, — расказвае Алена Яўгенаўна. Некаторы час працавала экскурсаводам.

І ўсё ж яна была скіравана на больш практычную работу. У хуткім часе ёй даверылі секцыю птушак.

— Гэта была мая любімая работа. У мяне былі ручныя пеліканы, жураўлі, папугаі. Многія наведвальнікі звярталіся да мяне па кансультацыі, раіліся, іншы раз самой даводзілася лячыць сваіх выхаванцаў. Калекцыя птушак вялікая, нямала рэдкіх відаў. У тым ліку былі ара гіяцынтавыя, вельмі вялікія і рэдкія папугаі, больш за метр ростам, какаду некалькіх відаў, калекцыя жураўлёў. Я і зараз наведваю сваіх выхаванцаў, хоць цяпер у мяне іншая пасада. Працую адміністратарам заапарка, але многія птушкі мяне памятаюць. Стараюся падказаць маладым спецыялістам, на што варта звярнуць увагу пры рабоце з птушкамі. Бачу, што мой вопыт для іх каштоўны, моладзь прыслухоўваецца, і мяне гэта радуе, — працягвае суразмоўніца.

У адміністратара Алены Шабалоўскай нямала абавязкаў. Па сутнасці, на ёй трымаецца ўвесь парадак заалагічнага парку. Трэба сачыць за тым, каб усё было прыбрана, трава пакошана, расліны дагледжаны. Іншы раз і кветкі прыходзіцца садзіць, і прыбіраць. «Тут не пасядзіш, гаспадарка клапатлівая, за дзень не адзін кіламетр па заапарку накруціш», — з усмешкай кажа Алена. Затое колькі цікавых выпадкаў можа ўзгадаць за час работы. У тым ліку стрэсавых. Напрыклад, калі драпежныя жывёлы нейкім чынам пакідалі свае клеткі і нават выходзілі ў горад. Так, гараджан аднойчы папярэдзілі аб знікненні з вальера пумы. Праўда, потым яе знайшлі пад мосцікам у самім заапарку, але званкоў ад гродзенцаў паступіла нямала, быццам бачылі тую пуму ва ўсіх канцах горада. А вось рысь сапраўды злавілі па-за межамі заапарку, яна зайшла ў склады непадалёку. Яшчэ з вальераў выходзілі леапард, тыгр, мядзведзі.

— У мяне была сітуацыя, калі я перажыла вялікі стрэс, звязаны з куланам. У нас працавалі возчыкі, якія на конях развозілі ежу. І кулан іх чамусьці вельмі не любіў, праяўляў агрэсію нават пры іх набліжэнні, кідаўся на вальер. Аднойчы яго трэба было перагнаць у вулічны вальер. Калі ён выходзіў, возчык якраз пачаў паіць коней. Кулан гэта пачуў, вырваўся і пачаў іх кусаць. Думалі, што жывёла звар'яцела. Я забегла ў клетку разам з возчыкам, а кулан кідаўся на яе, было страшна. Праўда, усе гэтыя недарэчнасці адбыліся яшчэ ў «старым» заапарку. Пасля рэканструкцыі сістэмы бяспекі тут больш надзейныя і прадуманыя, таму падобных з'яў больш няма, — заўважае жанчына.

Калекцыя жывёл папаўняецца, — працягвае яна. — Пасля татальнай рэканструкцыі ўмовы для пітомцаў значна палепшыліся. Нядаўна тут упершыню з'явіліся джайраны і японскі журавель. Багатая калекцыя рыбак і рэптылій.

Праз тры гады заапарк адзначыць сваё стагоддзе, і Алена Шабалоўская спадзяецца, што сустрэне векавы юбілей у сваім родным калектыве.

— Работа для мяне — важная частка жыцця, я без заапарку сябе не ўяўляю. Ён для мяне не менш важны, чым дом, па сутнасці, гэта другі мой родны куток, дзе я працую роўна паўстагоддзя. Прыйдзецца некалі пайсці, але і я гэтага ніяк не магу ўсвядоміць. Мая дачка лічыць, што калі я сыду з працы, пачну хварэць. Пакуль адчуваю сябе бадзёра, рэдка хаджу на бальнічны. Таму па магчымасці буду працаваць, — разважае жанчына.

Яна не тоіць, што людзі ў заапарку патрэбны. Асабліва на рабочыя спецыяльнасці. Цяпер калектыў склаўся дружны, прыходзяць маладыя спецыялісты, якім патрэбны вопыт такіх старажылаў, як Алена Яўгенаўна. Яна ахвотна дзеліцца тонкасцямі работы з жывёламі. Такі яна чалавек — адкрыты, працавіты і адказны. Увогуле, як і многія іншыя яе калегі, для якіх праца — не проста нейкі вызначаны адрэзак часу, а жыццё, напоўненае важным сэнсам.

### УЛАДАР ЭЛЕКТРЫЧНЫХ СХЕМ

**Слесар электрамантажных работ Гродзенскага завода гандлёвага машынабудавання Уладзімір Высоцкі займаецца электрычнай камплектацыяй абсталявання, якое выпускаецца на прадпрыемстве.**

Адразу звяртаю ўвагу на поўнае падабенства імя і прозвішча з вядомым бардам. Аказваецца, гродзенец яго даўнішні прыхільнік. «У маёй маладосці яго песні былі вельмі папулярныя, — кажа ён. — У нейкім сэнсе нават выхоўвалі». Ці тыя жыццёвыя песні, ці склад характару Уладзіміра Мікалаевіча такі надзейны, але вось ужо амаль 50 гадоў ён нязменна працуе на заводзе, адзін з ветэранаў прадпрыемства. І ўвесь гэты час спасцігае новыя асаблівасці абсталявання.

— Прыходзіцца новая дакументацыя — трэба ўмець яе чытаць, ведаць схемы. Вось, бачыце, якое ў пасудамыечнай машыне электраначынне. Раней была механіка, цяпер электроніка. Усё мяняецца, таму трэба пастаянна вучыцца, каб авалодваць такімі схемамі, — расказвае спецыяліст.

Прадпрыемству больш за 60 гадоў. Можна сказаць, што ўвесь вытворчы шлях завод праходзіў не толькі на вачах Уладзіміра Мікалаевіча, але і з яго ўдзелам. Ён быў сведкам таго, як была наладжана вытворчасць у савецкі час, калі на заводзе нават працаваў філіял маскоўскага навукова-даследчага інстытута. З развалам Саюза завод хоць і перажываў складаныя часы, але дзейнасць не спыніў. Цяпер тут выпускаецца патрэбнае і складанае абсталяванне. У тым ліку медыцынскія боксы, электранагравальнікі, пасудамыечныя машыны, гідраакумулятары і іншая прадукцыя.

Наш суразмоўца якраз займаецца электрамантажнымі работамі пасудамыечных машын. Гэта не тая бытавая тэхніка, якую мы прывыклі бачыць у дамах, а цэлы вялікі комплекс агрэгатаў для адпаведных устаноў і гандлю. За гадзіну такая машына спраўляецца з трыма тысячамі талерак. Тут выпускаюць некалькі відаў такога абсталявання. За гады паставак многія спажыўцы ўпэўніліся ў іх якасці і заказваюць

# ЛЕЧЫЦЬ

На пытанне, ці не складана ўжо 10 «лішніх» гадоў штодзень ездзіць на работу за восем кіламетраў, Людміла Рыгораўна адказвае катэгарычна: я не магу проста сядзець дома. «Бывае, што пасля напружаных мерапрыемстваў мне хочацца эмацыянальна і фізічна адпачыць, але на гэта хапае аднаго дня. Мне трэба пастаянна нечым займацца. Нават дома ўжо не трымаю гаспадарку, але ж маю шэсць катоў, якіх трэба даглядаць. Вельмі люблю займацца кветкамі, гэта мая аддушына. А гаварыць аб тым, што я ўжо стамілася працаваць у культуры, не магу», — тлумачыць жанчына.

Нягледзячы на тое што культурнай адукацыі ў гераіні няма, яна змагла за доўгія гады напрацаваць аўтарытэт і павагу з боку калег. Людміла Аляксеева — жаданы артыст на святах у іншых Дамах культуры раёна, яна часта прадстаўляе Віцебшчыну на вакальных конкурсах і, што радуе, паспяхова. Так, летась загадчык СДК заняла першае месца на гарадскім конкурсе ваенна-патрыятычнай песні «Галасы Айчыны», ёсць у вялікай скарбонцы ўзнагарод і трэцяе месца на рэспубліканскім конкурсе «Сэрцам датычныя», падзяка ад кіраўніцтва райвыканкама. Прадстаўляла Аляксеева Віцебшчыну і на адборачным туры тэлевізійнага праекта «Зорны шлях».

Падчас размовы Людміла Рыгораўна раскрыла некалькі сакрэтаў бадзёрага настрою і прафесійнага майстэрства. Найперш, яна ніколі не прыносіць на работу свае асабістыя праблемы і пытанні. «Я не люблю псаваць некаму нервы толькі таму, што ў мяне нешта здарылася. Бывае, што настрой сам па сабе не зусім пазітыўны, тады падчас абеду, калі ўсе разышліся з клуба, уключаю мікрафон і спяваю свае любімыя кампазіцыі. Песні мяняюць усё, гэта праўда. А творчасць увогуле лечыць. Мне пашанцавала, што хобі перарасло ў прафесію. Я лічу гэта вялікім шчасцем і адным са складнікаў таго, што нават на пенсіі ў мяне ёсць запал і сілы працаваць», — дзеліцца гераіня.

Яна выхавала дзвюх дачок, якія таксама ўзялі ад маці творчы пачатак і ў юнацтве выступалі на сцэне. Людміла Рыгораўна з самага нараджэння выхоўвае ўнука, які дагэтуль, у 22-гадовым узросце, выступае з бабуляй на адной сцэне. За дзесяць гадоў работы ў сферы культуры праз Аляксееву прайшло не адно пакаленне дзяцей, многія з якіх дагэтуль застаюцца аддanымі вясковай мастацкай самадзейнасці, у ліку іх — і я, аўтар гэтых радкоў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

# ЖЫЦЦЯ

## і паўстагоддзя



менавіта іх. Ідзе прадукцыя і на расійскі рынак.

Уладзімір Мікалаевіч, здаецца, ведае ўсе асаблівасці і параметры сваіх машын. Ён займаецца поўнай зборкай электроннага начыння, якое змяшчаецца ў некалькіх невялікіх скрынях. «Калі б не электроніка, гэтыя скрыні былі б у некалькі разоў большыя, — кажа майстар. — А так яны выглядаюць кампактна, дазваляюць кіраваць многімі функцыямі. Такім чынам, душ, паласканне, сушка, абдзіманне — гэта ўсё ідзе ў аўтаматычным рэжыме», — тлумачыць спецыяліст.

Уладзіміру Высоцкаму нядаўна споўнілася 70 гадоў, а ён поўны сіл і энергіі, з'яўляецца перадавіком вытворчасці, больш за 30 гадоў быў брыгадзірам. Работа, як і для большасці прадстаўнікоў яго пакалення, з'яўляецца важным складнікам лёсу. «Жонка ўжо просіць, каб я сыходзіў, але бачу, што патрэбен тут, інакш, мабыць, сышоў бы... Плацяць дастойную зарплату, умовы добрыя, за стаж надбаўка, добрыя адносіны з боку кіраўніцтва завода», — пералічвае ветэран перавагі вытворчага жыцця.

— Адсутнасць гэтага чалавека будзе адразу заўважана, — каменціруе старшыня пярвічнай арганізацыі прафкама завода Анатоль Леваненя. — Ідзе змена пакаленняў, вопыт варта перадаваць, але нам важна захаваць і нашы кваліфікаваныя кадры. Работы шмат, абсталяванне пастаянна мадэрнізуецца. Але новыя тэхналогіі без кваліфікаваных кадраў наўрад ці дадуць эканамічны эфект. Таму важна клапаціцца аб людзях, забяспечваць ім камфортную працу. На прадпрыемстве значна палепшыліся бытавыя ўмовы, своечасова выплачваецца заработная плата. А ўзрост для работы не перашкода.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# «НАША ШЧАСЦЕ — У ПОЛІ...»

## Аб рабоце ў камандзе і радасці працы на зямлі — гісторыя майстра-наладчыка з Гомельскага раёна

**«Здараецца, ноч не сплю — пракручваю, разбіраю ў галаве вузлы, хвалююся, як лепш справіцца і выпусціць машыну. І такая «драбядзень» цэлы дзень... Лепш, чым радкамі савецкага паэта, настрой не апішаш. Але ў жыццёвым рытме Міхаіла Міхаленкі музыка рамонту, здаровы шум машыны, якая рвецца з гаража ў поле, — самая любімая. Адказная праца ў гэтага працаўніка — сапраўдная аддушына і справа ўсяго жыцця. Мець такога спецыяліста ў сваёй камандзе пашанцавала калектыву ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Гомельскага раёна.**



Міхаілу Мікалаевічу — 77 гадоў. Ён наладчык сельгасмашын і трактароў. Вось ужо 35 гадоў працуе ў роднай гаспадарцы ў аддзяленні «Грабаўка». Ён адзін з самых шаноўных па ўзросце працаўнікоў птушкафабрыкі «Рассвет».

Калісьці малады перасяленец з трыццацікіламетровай чарнобыльскай зоны ў імгненне застаўся без жылля і работы. Дапамагла пракарміць сябе і маладую сям'ю, падарыла новае месца для жыцця менавіта спецыяльнасць. Міхаіл Мікалаевіч у свой час скончыў Буда-Кашалёўскі тэхнікум механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Разам з жонкай Ганнай Аляксандраўнай — эканамістам па спецыяльнасці — яны прыехалі працаваць у Грабаўку. Тут выгадавалі дваіх дзяцей, дачакаліся траіх унукаў і ўжо праўнучку.

— Пачынаў у гаспадарцы кіроўцам. Потым, калі атрымаў дыплом па спецыяльнасці ў Буда-Кашалёве, мне прапанавалі быць загадчыкам рамонтных майстэрняў. Прапрацаваў больш чым восем гадоў у гэтай якасці, а пасля перайшоў у майстры-наладчыкі сельгасмашын і трактароў. Ужо пятнаццаць год на гэтым участку. Разбіраем, рамантуем, наладжваем, выпускаем на лінію ў поле розныя сельгасмашыны, трактары, камбайны, — распавядае Міхаіл Міхаленка.

14 гадоў таму Міхаіл Мікалаевіч мог пайсці на заслужаны адпачынак, але застаўся і працягвае працаваць.

— Праца для мяне — аддушына, — прызнаецца майстар-наладчык. — Мая задача — вызначыць, які рамонт, у якой паслядоўнасці, як будзем праводзіць, што з дэталяў, вузлоў можна рэстаўрыраваць, а што трэба мяняць. Увесь працэс дзелім паміж майстрамі. Калі іншы раз не атрымалася, не скончылі працу да канца дня, то ляжаш спаць і ўсё думаеш, як заўтра лепш гэта зрабіць, каб выпусціць машыну ці трактар на лінію ў поле, бо калі тэхніка нейкая выйшла са строю — збілася работа не аднаго чалавека. Тэхніка не павінна стаяць у гаражы, павінна працаваць, таму што грошы нас, вяскоўцаў, — у полі.

Часам, кажа працаўнік, даводзілася затрымлівацца ў майстэрні і да дзесяці-адзінаццаці вечара. Жонка Міхаіла Мікалаевіча не перажывае, разумее ўсё, бо сама ў гаспадарцы шмат гадоў прапрацавала галоўным эканамістам.

— У гарачую пару і ў суботу, і ў нядзелю працуем. У нядзелю іншы раз раненька прыбягу — мне ад дома да гаспадаркі паўкіламетра, — гляджу, выйшлі ў поле нашы. Усё — шчасце! Значыць, усё добра, — расказвае працаўнік.

Для родных, аднавяскоўцаў і калег у калектыве прозвішча галавы сямейства гучыць ганарова. Адрамантавана, праверана Міхаленкам: у рабоце — знак якасці, для маладога папаўнення працаўнікоў гаспадаркі, прыклад адказнага стаўлення.

— Прыходзіш на работу з самай раніцы і чуеш: «Мікалаевіч, трэба, каб вы глянулі». Просяць, каб параіў-паглядзеў і дасведчаныя механізатары, якія гадамі працуюць, і моладзь чакае парады ў рамонце. Гэта, безумоўна, прыемна, што ты патрэбны, што твае веды, вопыт цікавыя, — кажа Міхаіл Мікалаевіч.

Рыхтуе да самастойнай працы, навучае майстар-наладчык маладых спецыялістаў — выпускнікоў каледжаў.

— Прыходзіць да нас моладзь і на практыку. Прымаем добра. Мы сяброўскія, калі любіш працу, з намі будзе, сапраўды, нясумна, — пераконвае Міхаіл Мікалаевіч.

У Грабаўцы ён адзіны з вяскоўцаў-равеснікаў, хто яшчэ працягвае працаваць.

— Я ўжо таксама — кандыдат... Тым не менш столькі гадоў у прафесіі, а ўсё роўна — трэба пастаянна вучыцца, — прызнаецца вясковец. — Кожны год новая тэхніка, нешта новае трэба чытаць, запамінаць. Гэта таксама даводжу моладзі. Памятаю, калі я прыйшоў у гаспадарку, таксама былі пажылыя мужыкі, вельмі добрыя спецыялісты — працаўнікі ад бога. Мне пашанцавала, навучылі і ў такарных работах разбірацца. Быў час — не было токара, дык і ля станка стаяў. Цяпер таксама талковыя і зваршчыкі, і трактарысты праходзяць. Ёсць і здольнасці, і веды, было б толькі жаданне працаваць на вёсцы, і ўсё атрымаецца. Маладым кажу, што яны павінны разумець: іх абавязак — зямлю араць і апрацоўваць. Адыходзіць старэйшае пакаленне, мы навучым, колькі бог дасць часу — дапаможам, але і яны таксама павінны імкнуцца. Мая парада для маладых: больш радавацца кожнаму дню, кожнай справе, поспехам і нават няўдачам. А яшчэ раю больш размаўляць, пытацца, цікавіцца.

Міхаіл Мікалаевіч падзяліўся, што свой рэцэпт шчаслівага жыцця і працы ён знайшоў у «цэпкіх, моцных каранях» свайго роду, сям'і.

— Дагэтуль сняцца палі на маёй малой радзіме — Хойніцкі раён, вёска Пагоннае, саўгас «Перамога сацыялізму». Мае тата і мама працавалі ў гаспадарцы. Бацька пражыў 102 гады, да васьмідзесяці — прапрацаваў механізатарам. Я з сёмага класа яму дапамагаў у полі, быў памочнікам камбайнера. Марыў пасля службы ў войску вярнуцца і застацца працаваць дома, але родную вёску забраў Чарнобыль. Мы жылі за 12 кіламетраў ад ЧАЭС. Выратавала праца, жыццё на зямлі. Мой бацька, дарэчы, да ста гадоў яшчэ працаваў на лецішчы, трымаў агарод, даглядаў вялікі сад. Я ў рабоце імкнуўся быць не горшым, не падвесці свой род. Гэта пачуццё, лічу, дапаможа і моладзі і ў рабоце, і ў жыцці, — перакананы суразмоўнік.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА. Фота з архіва героя.**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы аукциона | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70546 (наименование: здание для откорма скота; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 2047,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Радваничский с/с, 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001027553, площадью 1,4951 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика, площадка для складирования навоза, водонапорная башня, артскважина, погрузочно-разгрузочная рампа стационарная с весами | 116 900,00 | 11 690,00 |
| **Лот № 2:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-96314 (наименование: зерносклад; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения), площадью 317,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 38А/5, зерносклад, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000091, площадью 0,1075 га | 35 760,00 | 3 576,00 |
| **Лот № 3:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-74045 (наименование: зернохранилище; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1111,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 66/ 2, на земельном участке с кадастровым номером 121281200001000021, площадью 0,3055 га | 115 200,00 | 11 520,00 |
| **Лот № 4:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71136 (наименование: Телятник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1441,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 39В, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000117, площадью 0,5552 га, составные части и принадлежности: уборная, выгульный дворик, рампа погрузо-разгр., пожарный резервуар, площадка для мусора | 140 800,00 | 14 080,00 |
| **Лот № 5:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71128 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 321,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 60/5, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000118, площадью 0,1666 га, составные части и принадлежности: артскважина, сенажная траншея | 36 000,00 | 3 600,00 |
| **Лот № 6:**<br>1) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71274 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения), площадью 471,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/4, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124, площадью 1,2527 га;<br>2) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70118 (наименование: здание красного уголка; назначение: здание административно-хозяйственное), площадью 25,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124, площадью 1,2527 га;<br>3) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70119 (наименование: здание склада; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 252,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/1, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124, площадью 1,2527 га;<br>4) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70116 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1322,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/3, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124, площадью 1,2527 га, составные части и принадлежности: два выгульных дворика для молодняка, площадка для навоза, две сенажных траншеи, артскважина;<br>5) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70115 (наименование: здание телятника; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 682,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 49/2, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000124, площадью 1,2527 га, составные части и принадлежности: выгульный дворик, рампа погрузо-разгрузочная с весами | 226 319,39 | 22 631,94 |
| **Лот № 7:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70231 (наименование: телятник фермы № 5; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 898,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 21, телятник фермы № 5, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001002521, площадью 0,5617 га, составные части и принадлежности: два навеса | 120 000,00 | 12 000,00 |
| **Лот № 8:** капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70232 (наименование: коровник № 5; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1037,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Клейниковский с/с, 20, коровник № 5 в районе дер. Непли, на земельном участке с кадастровым номером 121200000001002520, площадью 0,2483 га | 112 000,00 | 11 200,00 |
| **Лот № 9:**<br>1) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71675 (наименование: телятник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1830,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71, телятник, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058, площадью 1,8556 га, составные части и принадлежности: площадка для складирования подстилки и навоза, дворовое покрытие, забор, забор;<br>2) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-70600 (наименование: телятник; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1848,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/2, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058, площадью 1,8556 га, составные части и принадлежности: Покрытие выгульного дворика, бетонное покрытие, забор;<br>3) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71261 (наименование: склад соли; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 169,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/11, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058, площадью 1,8556 га;<br>4) капитальное строение с инвентарным номером 100/С-71421 (наименование: склад ТМЦ; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 237,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, 71/12, на земельном участке с кадастровым номером 121283000001000058, площадью 1,8556 га | 530 289,33 | 53 028,93 |

**Продавец:** ОАО «Селекционно-гибридный центр «Западный», Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, 80162918159, тел./факс 80162918159. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** 100 % оплата в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 07 августа 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 06 августа 2024 г. до 17.00**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного торгового унитарного предприятия «ЗападХимТорг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3283-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041487, 2019 г. вып. | 35 856,00 | 3 585,60 | 1 792,80 |
| 2 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3305-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028025, 2019 г. вып. | 35 424,00 | 3 542,40 | 1 771,20 |
| 3 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3593-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041519, 2019 г. вып. | 35 424,00 | 3 542,40 | 1 771,20 |
| 4 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3354-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028023, 2019 г. вып. | 34 236,00 | 3 423,60 | 1 711,80 |
| 5 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3261-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041511, 2019 г. вып. | 36 288,00 | 3 628,80 | 1 814,40 |
| 6 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3279-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041536, 2019 г. вып. | 38 232,00 | 3 823,20 | 1 911,60 |
| 7 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3304-4, кузов (рама) № VF18SRPL464049358, 2019 г. вып. | 35 856,00 | 3 585,60 | 1 792,80 |
| 8 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3590-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041504, 2019 г. вып. | 35 856,00 | 3 585,60 | 1 792,80 |
| 9 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3348-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028004, 2019 г. вып. | 35 424,00 | 3 542,40 | 1 771,20 |
| 10 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3350-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041515, 2019 г. вып. | 34 020,00 | 3 402,00 | 1 701,00 |
| 11 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3346-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028012, 2019 г. вып. | 36 288,00 | 3 628,80 | 1 814,40 |
| 12 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3336-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028010, 2019 г. вып. | 34 020,00 | 3 402,00 | 1 701,00 |
| 13 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3589-4, кузов (рама) № VF18SRPL463766911, 2019 г. вып. | 34 992,00 | 3 499,20 | 1 749,60 |
| 14 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3588-4, кузов (рама) № VF18SRPL464027994, 2019 г. вып. | 34 236,00 | 3 423,60 | 1 711,80 |
| 15 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3579-4, кузов (рама) № VF18SRPL463725281, 2019 г. вып. | 36 288,00 | 3 628,80 | 1 814,40 |
| 16 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3290-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041530, 2019 г. вып. | 34 560,00 | 3 456,00 | 1 728,00 |
| 17 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3356-4, кузов (рама) № VF18SRPL464027995, 2019 г. вып. | 34 560,00 | 3 456,00 | 1 728,00 |
| 18 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3595-4, кузов (рама) № VF18SRPL463725299, 2019 г. вып. | 35 856,00 | 3 585,60 | 1 792,80 |
| 19 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3295-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041537, 2019 г. вып. | 34 236,00 | 3 423,60 | 1 711,80 |
| 20 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3586-4, кузов (рама) № VF18SRPL464027999, 2019 г. вып. | 35 424,00 | 3 542,40 | 1 771,20 |
| 21 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3352-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041525, 2019 г. вып. | 34 992,00 | 3 499,20 | 1 749,60 |
| 22 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3281-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041523, 2019 г. вып. | 34 236,00 | 3 423,60 | 1 711,80 |
| 23 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3592-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028008, 2019 г. вып. | 36 288,00 | 3 628,80 | 1 814,40 |
| 24 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3341-4, кузов (рама) № VF18SRPL464027992, 2019 г. вып. | 34 560,00 | 3 456,00 | 1 728,00 |
| 25 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3303-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028007, 2019 г. вып. | 34 560,00 | 3 456,00 | 1 728,00 |
| 26 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3277-4, кузов (рама) № VF18SRPL464049345, 2019 г. вып. | 34 992,00 | 3 499,20 | 1 749,60 |
| 27 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3301-4, кузов (рама) № VF18SRPL464041532, 2019 г. вып. | 36 828,00 | 3 682,80 | 1 841,40 |
| 28 | Автомобиль грузовой вагон (WAGON) RENAULT DOKKER, рег. № АМ 3337-4, кузов (рама) № VF18SRPL464028016, 2019 г. вып. | 37 260,00 | 3 726,00 | 1 863,00 |

В отношении лотов проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Рэспубліка» от 18.06.2024

**Местонахождение лотов:** г. Минск, ул. Калиновского, 117

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **5 августа 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 23 июля 2024 года до 16.00 1 августа 2024 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», частное предприятие «ЗападХимТорг», проводимых 05.08.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пять) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 7 (семи) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **+375293042560 (Андрей)**. Дополнительная информация по лотам: **+375293042560 (Андрей), +375293082762 (Екатерина)**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур) (231335, Гродненская область, Ивьевский район, с/с Липнишковский, аг. Липнишки, ул. Виленская, д. 12А, корпус 1, комн. 6, УНП 590828925)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Па-дэпутацку, па-жаночы...

# КАЛІ ДЗЕТКІ — НЕ ЦУКЕРКІ

**«Я маю права...» — думаю, што наўрад ці знойдуцца бацькі, якім нашчадкі не заяўлялі падобнае. Безумоўна, маеце, дарагія дзеці! І вашы правы абараняюць усюды. На заканадаўчым узроўні, на ўсялякі выпадак, прыняты асобны Закон «Аб правах дзіцяці», які дзейнічае з 1993 года, а яшчэ Нацыянальная камісія па правах дзіцяці — якраз аналізуе забеспячэнне абароны гэтых правоў і законных інтарэсаў дзяцей у нашай краіне. І, паверце, гэта толькі малая крыха той заканадаўчай базы, якая заклікана забяспечваць і кантраляваць правы дзіцяці. Толькі пералік міжнародных дакументаў зойме процьму часу, пачынаючы ад Канвенцыі па правах дзіцяці. Не спрачаюся — правы дзіцяці павінны абараняць усе ўсюды і заўсёды, але яшчэ важней, каб і дзіця не толькі ведала і патрабавала выканання сваіх правоў, разумела і выконвала абавязкі і, вядома ж, адказвала за свае ўчынкі. Любыя правы і любая свабода — гэта, перш за ўсё, адказнасць.**



Як знайсці баланс пры выхаванні дзіцяці, каб і правы захоўваліся, і абавязкі выконваліся? Я невыпадкова закранула гэту тэму і акцэнт хачу зрабіць менавіта на абавязку выканання законаў нашымі дзецьмі. Хоць не такое ўжо і дзіця... у 14 гадоў, калі надыходзіць крымінальная адказнасць па шматлікіх злачынствах.

Ах, праблема бацькоў і дзяцей... Неяк я прачытала папірус Прыса, які лічыцца самай старажытнай кнігай на Зямлі. Па меркаванні навукоўцаў, яна напісана прыкладна ў 3350 годзе да нашай эры, вось толькі тэма яе вечная — паколькі шматлікія навукоўцы сцвярджаюць, што дадзеная праца была напісана ў якасці павучанняў бацькоў сынам. Прывяду толькі адну цытату, якая абвяшчае: «Моладзь пайшла не тая. Усе жадаюць стаць пісьменнікамі, і ніхто не жадае працаваць. Не слухаюць старэйшых». Пагадзіцеся, што сёння гэтая фраза гучыць таксама, хіба што «пісьменнікаў» замяняюць на «айцішнікаў». Вы толькі ўявіце, гэта амаль пяць з палавай тысячагоддзяў таму, а нібыта сёння!

Усё гэта я вяду да таго, як важна ні ў сям'і, ні ў школе не згубіць нітачку даверу, які, як правіла, заўсёды ёсць у падлетка з бацькамі, з настаўнікамі, але ў нейкі момант знікае, і тады падлетак здзяйсняе злачынства. Вядома, давер аднамомантна выпарыцца не можа, а, значыць, гэтаму папярэднічалі пэўныя падзеі, якія і падштурхнулі да расчаравання, а потым і да акту непадпарадкавання.

Злачыннасць дзяцей і падлеткаў — асаблівая трывога і для міліцыі, і для грамадства ў цэлым. Адны ідуць на сур'ёзныя парушэнні закона за кампанію, іншых штурхаюць фінансавыя цяжкасці, трэція пераступаюць закон дзеля забаўкі.

Але, хто б што ні казаў, як бы ні лаялі школу, калі непаўналетні здзяйсняе злачынства — віна бацькоў ёсць адназначна. Такое маё меркаванне. Уяўляю, колькі зараз у мой адрас паляцела стрэл... І ўсё роўна паўтару: значыць бацькі нешта ўпусцілі, нешта не заўважылі, нешта праігнаравалі... Я не кажу, што ў бацькоў не было нейкіх прычынаў на гэта. Бо вельмі часта мамы выхоўваюць дзяцей адны і проста фізічна не паспяваюць сачыць за імі так, як хацелася б. Але адказнасць гэта, на жаль, не здымае.

Многія могуць задацца пытаннем, а з чаго гэта раптам дэпутат так «клапоціцца» аб злачыннасці падлеткаў. Адкажу, што не раптам. Больш за трыццаць гадоў таму, як зараз кажуць «у ліхія 90-я», я пачынала сваю работу ў дзяржаўных органах з камісіі па справах непаўналетніх. Тады структура падліткавай злачыннасці была іншай. Пераважалі крадзяжы і хуліганствы. Кралі са скляпоў, так званыя «закаткі» на зіму, у крамах прадукты харчавання — таму што хацелі есці. Тысячы разоў можна цытаваць нашага Прэзідэнта, калі, толькі прыйшоўшы на пасаду кіраўніка дзяржавы, ён гаварыў аб тым, што людзей трэба накарміць, а тым больш дзяцей. Я пра гэта кажу, ні ў якім разе не ў якасці апраўдання маленькім злачынцам, што яны хацелі есці, таму кралі, але быў зразумелы хоць бы матыў. Цяпер сітуацыя іншая.

Цяпер з'яўляюцца зусім новыя віды злачынстваў, і гэта значыць, што неабходна ўносіць змены ў дзейнае заканадаўства, часам прымаць абсалютна новыя законы. Пры гэтым у аснове застаецца пытанне, як у Чарнышэўскага: «што рабіць», каб не толькі не дапусціць росту, але і папярэдзіць учыненне злачынстваў нашымі дзецьмі?

Запэўніваю, думаць, што на парушэнне закона ідуць дзеці толькі з праблемных сем'яў — абсалютная памылка. Сёння правіны і злачынствы ўчыняюць і тыя, хто расце ў добрай сям'і, дзе ёсць і мама, і тата, і дастатак у хаце, і грошы на кішэнныя выдаткі... Але дзеці абсалютна ўпэўнены, што пакаранне іх не заспее. Яшчэ горш, калі няма страху перад пакараннем.

Вернемся да відаў злачынстваў. Скажаць, што адбылося ашаламляльныя змены, дык не. Працягваюць пераважаць крадзяжы, вось толькі спосабы іншыя, гэта вам ужо не скляпы са слоічкамі смачнасцяў, а выкарыстанне лічбавых тэхналогій, мабільных банкінгаў. Бо з бурным развіццём тэхналогій, інфармацыя ператварылася ў адзін з галоўных элементаў нацыянальнага багацця. Вось толькі «багацце» гэта нярэдка незаконна прысвойваюць. Пагадзіцеся, што тэхналагічныя і прамысловыя скачкі заўсёды ўплывалі не толькі на эканамічныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, як зараз, але і вялі да павышэння вынаходлівасці, калі хочацца — выдасканаленасці злачынцаў. Будзем называць рэчы сваімі імёнамі — падману людзей.

Асноўным спосабам здзяйснення крадзяжоў грашовых сродкаў з банкаўскіх рахункаў стала ашуканства пры дапамозе вішынгу і фішынгу. Можна пацікавіцца ў пажылых, што такое вішынг і фішынг, але баюся, што акрамя абурэння ды «моцнага слоўца», яны не змогуць адказаць нешта канкрэтнае.

Яшчэ адна праблема, пра якую мы ўжо не гаворым, аб'ём у набат — гэта незаконны абарот наркотыкаў. Цяпер у гэты брудны бізнес уцягваюць самую ўразлівую групу насельніцтва — непаўналетніх, падлеткаў. Нашых дзяцей... На жаль, хлопцы думаюць, што гэта кшталту квэста, і часта не ўяўляюць, наколькі сур'ёзнымі могуць быць наступствы такой «гульні».

Цяпер кожны падлетак ведае, што такое «закладка»: продаж наркотыкаў, расфасаваных у невялікія пакуначкі і прыхаваных у зацішным месцы, вельмі распаўсюджаны. І нават калі дзіця не збіраецца ўжываць, то яго, не сумнявайцеся, будуць спрабаваць прыцягнуць да распаўсюджвання. Вось толькі ў які момант «непаўналетні», дзіця — задумваецца пра адказнасць? Самае крыўднае, што, як правіла, толькі тады, калі ўжо ўсё адбылося і назад дарогі няма. Дакладней шлях адзін — арышт, турэмная камера і тэрмін пазбаўлення волі, прычым вялікі.

Так адбылося з гомельскім юнаком, які быў арыштаваны на вачах сваіх аднагодкаў і сяброў. Хлопец з добрай сям'і, з прэстыжнай навучальнай установы, літаральна два месяцы таму сядзеў у зале на такім жа публічным арышце такога ж падлетка.

Узнікае слушнае пытанне, калі ішоў рабіць закладку, не разумеў, што чакае такая ж доля? Яго адказ на гэтае пытанне быў просты: «Я думаў, што мяне не зловяць». А далей — больш. Хлопец вучыўся на «дзявяткі» і займаўся крыптавалютай, зарабіў, трэба сказаць, вельмі прыстойную для падлетка суму, каля пяці тысяч долараў. Але, як у мультфільме пра залатую антылопу: хачу больш, больш, больш... У адзін цудоўны дзень, спрабуючы зарабіць гэтае больш, уся крыптавалюта была страчана. Пачаліся пошукі новых спосабаў зарабіць і... знайшліся.

Няма патрэбы расказваць, як дзіця можа стаць удзельнікам наркабізнесу. Інтэрнэт «кішыць» заманлівымі аб'явамі аб тым, што патрабуецца высокааплатны кур'ер. Знаёмы прапануе «зарабіць без натугі», а падлеткі вельмі даюяраюць аднагодкам, ды і грошыкі патрэбныя. Першая закладка, а потым, думаюць яны, грошы ракой паплывуць, але...

Што рабіць бацькам? Колькі матчыных слёз праліта? І тут важна не забываць, што любая доза наркотыкаў — патэнцыяльная смерць.

Больш за пяць гадоў таму маці асуджаных падлеткаў па 328-м артыкуле Крымінальнага кодэкса аб'ядналіся ў нефармальны «Матчын рух 328». Чаму 328? Тым, хто не ў курсе: гэты нумар артыкула Крымінальнага кодэкса нашай краіны прадугледжвае пакаранне за «незаконны абарот наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсораў і аналагаў». Мне прыйшлося не аднойчы мець зносіны з маці, чые дзеці асуджаныя да вялікіх тэрмінаў пазбаўлення волі па дадзеным артыкуле. А прадугледжана па ім пакаранне ні многа, ні мала — да дваццаці гадоў пазбаўлення волі. І кожная з маці лічыла, што менавіта яе сын «трапіў выпадкова», «ні за што, ні пра што пасадзілі...» Вось толькі ці думаюць яны, што, калі б іх сын ужыў гэтыя самыя наркотыкі (зараз распаўсюджаны сінтэтычныя, смяротна небяспечныя для падлеткаў), як бы тады яны ставіліся да «закладчыкаў»? Міжволі хочацца прапанаваць мацяркам асуджаных сустрэцца з жанчынамі, якія страцілі сваіх дзяцей, або чые дзеці сталі наркаманамі пасля першай дозы.

І зноў пытанне: чаму працвераджэнне прыходзіць, толькі калі на запясцях прыгожых маладых хлопцаў зашчоўкваюцца кайданкі?..

Наогул, калі ўзяць злачыннасць як сацыяльную з'яву, то яна шмат у чым паказвае культуру нашага грамадства, усведамленне ім каштоўнасці права. Сёння злачыннасць з'яўляецца адной з найважнейшых сацыяльных праблем. Балюча, калі ў парушэнне законаў уцягваюць дзяцей, якія нават не дасягнулі ўзросту крымінальнай адказнасці. А ведаеце, што тыя, хто ўцягвае такіх маленькіх удзельнікаў, завуць іх «маладыя дарослыя», відавочна маючы на ўвазе, што гадуюць новае пакаленне злачынцаў свету.

Але ж нашым дзецям ад нас трэба так мала — наша ўвага і любоў. Лепшае, што можна выдаткаваць на дзяцей — гэта ваш час, знаходзьце яго, чаго б гэта ні каштавала, або потым не наракайце, што не дагледзелі.

**Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ.**

---

Дакументальнае кіно

# «БЕЛАРУСЬ-ПАРТЫЗАНКА»: ПОГЛЯД НА ПАДНЯБЕСНУЮ

**У дзень святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 3 ліпеня 2024 года, на тэлеканале АНТ адбыўся прэм'ерны паказ дакументальнага фільма «Беларускі фронт Паднябеснай» (аўтар сцэнарыя — член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы ў Беларусі і Расіі літаратар, аўтар многіх кніг у «маладагвардзейскай» серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» Вячаслаў Бандарэнка).**

Ужо на самым пачатку Дзмітрый Бачкоў (ён — вядучы фільма) заўважае: «Феномен сучаснага свету. Магутнейшая эканоміка, найноўшыя тэхналогіі. Знаходзячыся тут, верыш, што будучыня ўжо надышла. І ўсё гэта дзіўным чынам спалучаецца з трапяткім стаўленнем да гісторыі і традыцый...» Вядучы запрашае на свае вочы разглядзець велізарныя гмахі, культавыя мясціны Пекіна... І следам дадае: «...дзякуючы чаму і каму Кітай дамогся такога росквіту? Сярод мноства звыклых адказаў ёсць адзін, пра які амаль што не гавораць за межамі Паднябеснай, але толькі не самі кітайцы. Другая Сусветная для іх, як і для нас Вялікая Айчынная. Гісторыі, якія мы раскажам вам сёння, сведчаць менавіта пра гэта».

А далей — зусім нечаканая знаходка аўтараў. Нечаканая найперш для гледача... Расповед пра кінакамедыю «Джэнтльмены ўдачы». 1971 год. Упершыню фільм паказалі 13 снежня. Камедыю ў першы ж год паглядзела амаль 65 мільёнаў чалавек. Гледачам спадабаўся і эпізод з начальнікам калоніі, якога сыграў кітаец Уладзімір Уан-Зо-Лі. Яго лічылі буратам ці казахам, а ён — сапраўдны кітаец, хоць і нарадзіўся ў Расіі... І далей ідзе расповед пра тое, якой магутнай была хваля рабочай эміграцыі з Кітая ў Расію. Да вясны 1917 года ў Расіі знаходзілася каля 200 тысяч кітайцаў... І ў Беларусі з'явіўся свой цэнтр кітайскай дыяспары — у Віцебску і ваколіцах. Усяго ў Беларусь прыехала 119 перасяленцаў (згодна перапісу 1926 года)... У БССР яшчэ напрыканцы 1928 года ўзнік ці не першы калгас — і заснавалі «Кантонскую камуну» якраз кітайцы. Узначаліў гаспадарку Аляксандр Чжан Ван-фу, які ў грамадзянскую вайну служыў у Чырвонай Арміі, а затым — у міліцыі. У 1920-я гады шмат хто з кітайцаў жадаў трапіць у СССР. Сярод такіх ахвотных аказаўся і малады кітайскі лётчык Тан До. Ужо ён — і пра гэта таксама будзе ў фільме — стане генералам у Кітайскай Народнай Рэспубліцы, пройдзе выпрабаванне яшчэ адной вайною... Звесткі пра даўнія падзеі суправаджаюцца паказам дакументальнай кінахронікі.

Фільм «Беларускі фронт Паднябеснай» — гэта яшчэ і расповед пра лёсы ўраджэнцаў Беларусі, якія ваявалі ў Кітаі ў 1945 годзе за вызваленне Паднябеснай ад японскіх агрэсараў. Аўтар сцэнарыя расшукаў цікавінкі пра пяцёрку беларусаў, якія ў баях 1945 года ў Кітаі здзейснілі подзвігі і былі адзначаны высокім званнем Героя Савецкага Саюза.

У Савецкім Саюзе ў Вялікую Айчынную вайну загінула 27 мільёнаў чалавек. У Кітаі ў тыя ж самыя гады — болей 30 мільёнаў... Лічбы ўражваюць, яны як напамін пра еднасць лёсаў, пра тое, якімі выпрабаваннямі, якой цаною прыйшлі да мірнага жыцця нашы народы. Як уражвае і маштаб той дружбы, што існуе цяпер паміж Беларуссю і Кітаем. Напрыканцы фільма прыводзяцца словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі: «...Гэтай дружбе болей 30 гадоў, і з гэтага шляху мы ніводнага разу не звярнулі ні ўлева, ні ўправа. Таму і няма чаго даказваць пра нашу ўсепагодную, усебаковую дружбу і супрацоўніцтва». І — словы Сі Цзіньпіня, адрасаваныя Аляксандру Лукашэнку: «Мой вялікі сябра, вельмі рады яшчэ раз вас бачыць. У сучасным свеце адбываюцца тытанічныя змены. Узнікаюць новыя рызыкі і выклікі. Шмат што з таго, што адбываецца, для нас нечакана. Кітайскі бок гатовы разам з беларускімі партнёрамі ўмацоўваць стратэгічнае ўзаемадзеянне ў імя стварэння супольнасці Адзінага лёсу чалавецтва».

У фільме ўзяў удзел і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Кітаі Аляксандр Чарвякоў...

«Беларускі фронт Паднябеснай» — гэта яшчэ і першаштуршок да развіцця кінематаграфічнага летапісу беларуска-кітайскай дружбы ў 1950—1960-я гады. Менавіта ў тыя дзесяцігоддзі было надзвычай шмат стасункаў паміж БССР і КНР, шмат паездак прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі ў Паднябесную. Некалькі месяцаў працаваў у Кітаі скульптар Сяргей Селіханаў. З вялікай творчай паездкай пабываў у Кітаі, наведаўшы самыя розныя мясціны, Максім Танк. Вынікам яго вандроўкі стаў асобны паэтычны цыкл легендарнага беларускага творцы. У 1950-я гады ў Паднябеснай пабачылі свет у перакладзе на кітайскую мову кнігі Аркадзя Куляшова, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Янкі Маўра, Янкі Брыля, Петруся Броўкі, Кандрата Крапівы, Івана Шамякіна... Сяброўства ўмацоўвалася па самых розных кірунках гуманітарнага супрацоўніцтва. І далёка не лішнім будзе ўважліва агледзець гэтую і не такую даўнюю гісторыю і праз пільнае вока беларускага дакументальнага кіно.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# СОНЦА, ЗЁЛКІ І ВАДА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ** адзначыў, што аздараўленчая кампанія праходзіць у штатным рэжыме:

— Гэтым летам, як і папярэднім, адзначаецца ўстойлівы попыт на санаторна-курортны від паслуг. Санаторна-курортныя ўстановы запоўнены на 100 %. Падчас летняй аздараўленчай кампаніі ў іх штодзённа знаходзіцца больш як 25 тысяч чалавек, сярод іх каля 6-7 тысяч замежных грамадзян.



Устойлівы попыт на беларускія здраўніцы назіраўся цягам усяго першага паўгоддзя. Запаўняльнасць была на 3 % вышэй, чым за аналагічны перыяд летась, яна перавысіла 80 %. За паўгода санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне прайшлі 834 тысячы чалавек, што на 6 % больш, чым у першай палове 2023-га.

Выручка беларускіх санаторыяў павялічылася на 19 %. Такая ж станоўчая тэндэнцыя назіралася і па экспарце паслуг. За першае паўгоддзе прайшлі аздараўленне і лячэнне звыш 109 тысяч замежных грамадзян — у параўнанні з першым паўгоддзем 2023 года іх стала на 22 % больш. Па выручцы ад экспарту паслуг тэмпы росту павялічыліся на 37 %, замежнікі пакінулі ў нашых здраўніцах больш чым 170 мільёнаў рублёў.

Летась у нашай краіне адпачылі прадстаўнікі сямі дзясяткаў краін, у тым ліку госці з Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі, Аўстраліі. Вялікая частка замежнікаў з'яўляюцца выхадцамі з краін былога СССР. Дарэчы, у сувязі з бязвізам для грамадзян 35 еўрапейскіх дзяржаў, які дзейнічае з 19 ліпеня, у санаторыях раслічваюць на прыток замежнікаў.

— Мы да гэтага моманту адчувалі, што яны не могуць да нас даехаць. Прадстаўнікі гэтых краін выказвалі раней цікавасць, і многія з іх адпачывалі ў нашых санаторыях. Улічваючы, што яны змогуць знаходзіцца ў краіне да 30 дзён, я думаю, што многія скарыстаюцца магчымасцямі адпачынку ў нашых санаторыях, — адзначыла **загадчык сектара каардынацыі дзейнасці арганізацый аховы здароўя Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Беларусі Маргарыта ЛЕЎЧАНКА.**

Яна нагадала, што сёння ў сістэме Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта працуе сем санаторыяў. Адначасова яны могуць прыняць каля трох тысяч адпачывальнікаў. Чатыры санаторыі размешчаны на тэрыторыі Беларусі, тры з іх — у Мінскай вобласці: гэта «Юнацтва» (Мінскі раён), «Прыазёрны» і «Сосны» (Мядзельскі раён); санаторый «Баравое» знаходзіцца ў Бягомлі Віцебскай вобласці. Тры санаторыі размешчаны на тэрыторыі Расіі — «Белоруссия» (Ялта), «Белая Русь» (Туапсе), «Беларусь» (Сочы). Санаторыі прымаюць дарослых і дзяцей, а «Белая Русь» — арганізаваныя групы дзяцей, якія жывуць на тэрыторыях, што пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС.



Сярэдняя запаўняльнасць гэтых здраўніц складае 101,2 %. Самы запатрабаваны — санаторый «Юнацтва» — летам запоўнены на 115,2 %, санаторый «Прыазёрны» — на 102 %, «Сосны» — 108 %. Такія лічбы тлумачацца не ўшчыльненнем адпачывальнікаў, а тым, што многія сем'і прыязджаюць з дзецьмі, якіх засяляюць на дадатковых месцы ў нумары для бацькоў.

У мадэрнізацыю санаторыяў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта сёлета за пяць месяцаў укладзена каля 8,5 мільёна рублёў.

— Пры планаванні работы на 2023 год на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы санаторыяў меркавалася накіраваць каля 13 мільёнаў беларускіх рублёў. Падводзячы вынікі мінулага года, мы канстатавалі, што ўсяго на мадэрнізацыю санаторыяў было выдаткавана 25 мільёнаў — амаль удвая больш. На сёння на выніках пяці месяцаў у мадэрнізацыю ўкладзена каля 8,5 мільёна рублёў супраць чатырох мільёнаў за аналагічны перыяд летась, — прывяла лічбы Маргарыта Леўчанка.

Яна падкрэсліла, што ва ўсіх санаторыях прымаюцца меры па забеспячэнні якаснага і бяспечнага адпачынку, набывацца сучаснае медыцынскае і тэхналагічнае абсталяванне, праводзяцца маштабныя будаўнічыя работы, паляпшаецца і добраўпарадкоўваецца тэрыторыя.

— Камфортныя ўмовы адпачынку, магчымасці атрымання якаснага лячэння і аздараўлення — «фішка», якой ганарыцца сістэма Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, — дадала Маргарыта Леўчанка.

Пры гэтым з боку адпачывальнікаў вялікі попыт менавіта на санаторыі з максімальна камфортнымі ўмовамі. Найбольшай глыбінёй продажаў і браніравання адрозніваюцца менавіта санаторыі высокай цэнавай катэгорыі.

Па пуцёўцы ў свабодны рэалізацыі кошт ложка-месца ў стандартным двухмесным нумары ў сярэднім па паўгоддзі склаў 102 рублі. Пры гэтым ёсць і больш танныя нумары, і больш дарагія. Суткі знаходжання ў адным з самых дарагіх санаторыяў Беларусі — «Альфа-Радон» — каштуюць каля 600 рублёў, санаторыі «Плiса» — каля 450, санаторыі «Юнацтва» — 300 рублёў. У апошнім за такі кошт, акрамя ўласна пражывання ў камфортным нумары, адпачывальнік атрымлівае трохразовае харчаванне («шведскі стол»), кансультацыю ўрача, наведванне велнэс-цэнтра і пэўны пералік працэдур.

Аднак не толькі да камфорту патрабавальны сучасны адпачывальнік. Апраўдвае сябе і стаўка беларускіх санаторыяў на натуральныя лячэбныя фактары. За гэта іх цэняць тыя ж расіяне, якія складаюць пераважную большасць замежных наведвальнікаў нашых здраўніц.



— Наш цэнтр «Славянскае СПА» ўнікальны тым, што першы і адзіны ў Беларусі ўдастоены сертыфікатаў еўрапейскай якасці «EUROPESPA» і «EUROPESPAMED» за высокую якасць медыцынскіх і СПА-паслуг. У 2022 годзе мы ўвайшлі ў дзясятку найлепшых санаторыяў Еўропы пры пацвярджэнні гэтага сертыфіката. Чэк-лісты штогод мяняюцца, патрабаванні растуць. Спецыяліст, які пацвярджае сертыфікат, прыязджае на некалькі дзён, у яго поўны карт-бланш: ён можа зайсці ў нумары, на кухню, у кожны працэдурны кабінет параўнаць з любым адпачывальнікам, паглядзець наяўнасць сучаснага абсталявання і па шматлікіх крытэрыях пацвердзіць сертыфікат, — расказвае **намеснік дырэктара санаторыя «Юнацтва» Дзяніс БЯЖОК.** — Нашы спецыялісты спалучылі традыцыйную СПА з аюрведычнай. У нас трэнд на натуральнасць: зёлкі, натуральныя водарасці, гразі. Пры гэтым ад класікі ніхто не адыходзіць, выкарыстоўваецца дарагая касметыка.

Менавіта наяўнасць вялікай колькасці СПА-паслуг прыцягвае ў санаторыі вялікую колькасць маладых людзей.

— Стварылася ўражанне, і яно дастаткова ўстойлівае, што ў санаторна-курортныя арганізацыі ў асноўным прыязджаюць людзі старэйшага ўзросту — 50 плюс, — кажа Маргарыта Леўчанка. — Аднак гэта памылковае меркаванне. У «Юнацтве» запатрабаваныя не толькі традыцыйныя фізіятэрапеўтычныя метады лячэння, водалячэнне, гэта значыць стандартныя медыцынскія працэдуры, але і СПА-цэнтр, які прыцягвае на аздараўленне і аднаўленне людзей больш маладога ўзросту. У гэтым цэнтры нашы госці маюць магчымасць, адпачыць, расслабіцца, адмовіцца ад стрэсавых сітуацый, навучыцца іх правільна пераадольваць.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Поўнае аднаўленне пасля глабальнага ІТ-збою можа заняць тыдні




Аднаўленне поўнай працаздольнасці ўсіх сістэм, якія закрануў глабальны збой у рабоце тэхнікі на базе Windows, можа заняць тыдні. Пра гэта паведамляюць РІА «Новости» са спасылкай на газету The Guardian, якая прыводзіць меркаванні экспертаў у галіне лічбавых тэхналогій. У выданні паведамілі, што эксперты ўказалі на недастатковую гатоўнасць многіх кампаній да імклівых дзеянняў у надзвычайных сітуацыях, калі частка праграмнага забеспячэння выходзіць са строю. Яны мяркуюць, што падобнае можа зноў паўтарыцца, калі розныя фірмы не паклапоцяцца аб стварэнні належнай абароны і рэзервовых копій важнай інфармацыі. Глабальны збой пачаўся раніцай 19 ліпеня і закрануў сферу сувязі, банкаўскую сістэму і работу авіякампаній. Выданне Verge назвала прычынай такой з'явы памылковае абнаўленне ад пастаўшчыка кібербяспекі CrowdStrike, якое адключае камп'ютары і серверы ад сеткі, прымушаючы іх пераходзіць у цыкл аднаўлення, з-за чаго тэхніка не можа запусціць сістэму належным чынам.

### У Бангладэш адмянілі большасць квот на дзяржпасады, якія прывялі да пратэстаў



Вярхоўны суд Бангладэш адмяніў большасць квот на дзяржаўныя пасады, якія сталі прычынай масавых пратэстаў і беспарадкаў у розных гарадах рэспублікі. Пра гэта паведаміў тэлеканал India Today. Паводле яго даных, Вярхоўны суд адхіліў пастанову суда папярэдняй інстанцыі, якая аднаўляла квоты, указаўшы, што 93 працэнты дзяржаўных працоўных месцаў будзе адкрыта для кандыдатаў на падставе іх заслуг, а не сістэмы квотавання. З-за пратэстаў у Бангладэш адключаны інтэрнэт, тэлеканалы, сувязь працуе з перабоямі. У Даку і іншыя гарады ўведзены войскі. У выніку сутыкненняў на мінулым тыдні загінула больш як 150 чалавек, у тым ліку паліцэйскія.

### Успышка смяротна небяспечнага кішэчнага захворвання ахапіла 12 штатаў ЗША



У ЗША аб'явілі аб успышцы кішэчнага захворвання лістэрыёзу, якая ахапіла ўжо 12 штатаў уздоўж Усходняга ўзбярэжжа і на Сярэднім Захадзе. Пра гэта паведаміла РІА «Новости» са спасылкай на Цэнтр па кантролі за захворваннямі. У штатах Ілінойс і Нью-Джэрсі, паводле апублікаваных звестак, ужо памерлі два чалавекі. Яшчэ 28 хворых у іншых рэгіёнах шпіталізаваны. Улады ЗША праводзяць расследаванне, высвятляючы прычыны распаўсюджвання захворвання. Паводле наяўнай інфармацыі, многія заразіліся, калі ўжывалі ў ежу гатовыя мясныя і каўбасныя вырабы, набытыя ў прадуктовых крамах. Раней аб успышцы гэтага захворвання аб'явілі ў Канадзе, дзе таксама два чалавекі памерлі ад лістэрыёзу, яшчэ дзевяць былі шпіталізаваны. Сцвярджалася, што яны ўжывалі ахаладжальныя напоі раслiннага паходжання.

# КАЛІ ЗАКАНЧВАЕЦЦА РАМАНТЫКА

## Што такое гармоны задавальнення і стрэсу і як імі кіраваць?



**Часта даводзіцца чуць пра гармоны шчасця, задавальнення, стрэсу... Яны сапраўды валодаюць такімі эфектамі. Але ці можам мы кіраваць сваімі гармонамі і, такім чынам, сваімі эмоцыямі, пачуццямі і паводзінамі? Чаму мы нярэдка становімся рабамі гэтых гармонаў, якія прымушаюць нас скакаць пад сваю дудку? Як гэтаму спрыяюць інтэрнэт, гаджэты і новыя тэхналогіі? Пра гэта размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам ГАРБАННІДЖАДАМ.**

***— Давайце пачнем з прыемнага — «гармону задавальнення».***

— Дафамін называюць стваральнікам нашага раю і пекла адначасова. І залежыць гэта ад таго, як мы яго выкарыстоўваем. Насамрэч дафамін — гэта нейрамедыятар і «гармон добрых пачуццяў». Ён служыць важнай часткай «сістэмы ўзнагароджання» мозга: у той момант, калі мы атрымліваем ад нечага задавальненне, арганізм адорвае нас дафамінам. Гэта можа быць што заўгодна: мы атрымалі прыемную навіну, пасмяяліся з добрага анекдота, пазаймаліся любімым спортам, сексам, нешта смачна з'елі...

Дафамін ёсць і ў жывёл. Калі яны здабываюць ежу і з'ядаюць яе, увесь працэс суправаджаецца выпрацоўкай дафаміну. Гэта гармон, які накіроўвае да пэўнай мэты. Калі б дафаміну не было, жывёлы б вымерлі — ці ад голаду, ці не размнажаліся б. Дарэчы, у мэтанакіраваных людзей, якія пастаянна ставяць мэты і імкнуцца іх дасягаць, звычайна ўзровень дафаміну вышэйшы, чым у больш спакойных людзей.

У арганізме ёсць базавы ўзровень дафаміну. Падчас дафамінавых пікаў, якія здараюцца, напрыклад, пасля паспяховай здачы экзамену, іх узровень падымаецца вышэй за базавы. Аднак тут ёсць вялікае «але». Падчас пікаў дафамін не выпрацоўваецца, ён вызваляецца з запасаў, якія былі ў арганізме. Таму пасля дасягнення кожнага дафамінавага піку ўзровень яго падае ніжэй за базавы, наступае так званая «дафамінавая яма». У такі час назіраецца апатыя, лёгкая дэпрэсія пакуль дафамін ізноў не дасягне базавага ўзроўню.

***— Калі, за кошт чаго ён выпрацоўваецца?***

— Гэта адбываецца пастаянна, але паскорыць гэты працэс немагчыма. Патрэбна крыху часу, каб яго аднавіць. Чалавек без дафаміну не можа дасягнуць сваёй мэты. Студэнту патрэбны дафамін, каб здаць сесію і атрымаць дыплом, вучонаму — каб зрабіць навуковае адкрыццё. У той час калі мы расходуем дафамін на ўсялякую лухту і трапляем пасля ў дафамінавыя ямы, арганізм не можа яго хутка папаўняць.

***— На што мы яго выкарыстоўваем?***

— Напрыклад, калі глядзім у інстаграме ці ў тык-току відэа, чытаем ці глядзім «жоўтыя» навіны, харчуемся фастфудам. Людзі, якія ўжываюць наркотыкі, становяцца залежнымі найперш ад дафаміну. Яны ўжываюць дозу і атрымліваюць пік дафаміну. Калі такі чалавек працягвае празмерна стымуляваць сваю «сістэму заахвочвання», паступова мозг адаптуецца да ўзроўню дафаміну, які павышаецца штучна, вырабляючы менш гармона і зніжаючы колькасць рэцэптараў у «сістэме заахвочвання». Гэта адзін з фактараў, якія падахвочваюць чалавека, які прымае наркотыкі, павялічваць дозу для атрымання ранейшага эфекту.

Калі чалавек становіцца залежным ад дафаміну, пачынаецца пекла. Усе мы ўпадаем у рознага роду залежнасці: не можам жыць без інстаграма, страў хуткага харчавання, «жоўтых» плётак. Але прырода стварыла чалавека, каб ён дасягаў больш важных мэт — будаваў дом, сям'ю, рэалізоўваў сябе на працы і ў любімай справе. Аднак пры залежнасці ўжо нічога нецікава, пастаянны дэпрэсіўны стан і думкі, як атрымаць новую порцыю дафаміна. Некаторыя самагубствы багатых людзей звязаны з гэтымі дафамінавымі ямамі. Сын багатых бацькоў паспрабаваў усё, што хацеў, і ўжо не ведае, як атрымаць задавальненне.

Простыя рэчы, створаныя прыродай, якія раней і выклікалі задавальненне, цяпер ужо не цікавыя: як дзьме прахалодны ветрык, пахне куст бэзу, як восенню шапацяць пад нагамі лісце... Гэта дробязі, прырода зрабіла, каб мы атрымалі ад іх задавальненне. Аднак пакольки мы змарнавалі дафамін на ўсялякую лухту, нас не радуюць простыя рэчы.

Так сучасны чалавек ператвараецца ў зомбі і пастаянна мае патрэбу ў танным дафаміне, страчвае сваю мэтанакіраванасць. Замест таго, каб пабудаваць дом, стварыць сям'ю, ужывае цыгарэты, алкаголь, сядзіць на парнасайтах. У выніку марнуе дафамін, трапляе ў глыбокую дэпрэсію: у жыцці нічога не атрымалася і нічога не радуе.

Па гэтай жа прычыне з адносін знікае рамантыка. Дафамін выпрацоўваецца і падчас прыцягнення да сябе ўвагі з боку супрацьлеглага полу. Дзяўчына робіць макіяж, фарбуе валасы, прыгожа апранаецца, хлопец дорыць кветкі, запрашае на вячэру, у выніку рана ці позна ўсё заканчваецца сексам. Нярэдка сам працэс дасягнення мэты з боку дзяўчыны ці хлопца выклікае выкід большага ўзроўню дафаміну, чым падчас сексу. Калі ж дафамін расходуецца ўпустую, рамантыка заканчваецца. Навошта ісці гуляць з некім па парку, слухаць яго гісторыі, калі можна пасядзець у інстаграме? Раней рамантыкі было больш, бо не было таннага дафаміну. Сёння рамантыка многім нецікавая, дастатковая «сексу без цырымоній».

Дзецям важна тлумачыць, што калі мы ядзім, п'ём, карыстаемся гаджэтамі, трэба рабіць гэта адказна: калі вырашылі зрасходаваць дафамін, трэба ведаць — для чаго.

***— Супрацьлегласць дафаміну — гармон картызол. Раскажыце пра яго.***

— Па-іншаму яго называюць гармонам пакарання. Калі мы адчуваем стрэс, выпрацоўваецца картызол. Калі выклікае кіраўнік і робіць заўвагі ці крычыць на нас, мы адчуваем сябе прыгнечанымі, пакаранымі, нешчаслівымі. Гэта работа картызола. Дзеці караюць сваіх бацькоў картызолам: малое пачынае капрызнічаць, плакаць, валяцца па падлозе і біць нагамі — гэта спосаб уздзейнічаць праз гэты гармон.

Картызол патрэбны для таго, каб мы змагаліся з нейкімі небяспекамі: калі грыбнік сустракае ў лесе мядзведзя, то сіл хапае, каб залезці на дрэва, куды ў звычайным спакойным стане ён бы ніколі не забраўся. Праблемы пачынаюцца тады, калі картызол выпрацоўваецца пастаянна і мы ўвесь час знаходзімся ў стане стрэсу.

Тут трэба сказаць, што IQ чалавека — той паказчык, які дазваляе ацаніць разумовыя здольнасці, яго інтэлект, але не паказвае эрудыцыю, талент, крэатыўнасць. Лічыцца, што ў Шэкспіра IQ складаў 210, у Леанарда да Вінчы — амаль 220, яны — геніі. IQ каля 120—130 лічыцца высокім, 110 — нармальным, 90–100 — сярэднім, а 80–90 — нізкім. Дык вось калі мы злуемся і выходзім з сябе, знаходзімся ў моцным стрэсавым стане, наш IQ зменшаецца ў тры разы. Нават калі IQ геніяльнага чалавека падзяліць на тры, атрымаецца IQ чалавека з сіндромам Дауна.

Такім чынам, стрэс змяншае наш узровень інтэлекту. Калі гэта кароткачасова, нічога страшнага не адбудзецца. Нават сярэдні пад'ём картызола, які бывае, напрыклад, падчас сесіі ў студэнта, вялікай бяды не прыносіць. Дрэнна, калі картызол хранічна паднімаецца, мы пачынаем перажываць за тыя рэчы, пра якія непакоіцца не варта: негатыўныя навіны, якія нас не датычацца, перажыванні, што выйшаў апошні айфон і ён ужо ёсць у знаёмага, а ў мяне — няма, сусед набыў новы аўтамабіль, а я езджу на старым...

Штучныя «картызолавыя бомбачкі», якія падаюць у наша жыццё, хранічна паднімаюць узровень гармону стрэсу, што можа выклікаць дэпрэсіі, бяссонне, пастаянную прыгнечанасць, стрэс, болі ў суставах, хранічную стомленасць, мышачную слабасць, атлусценне, нізкую патэнцыю, цукровы дыябет, гіпертанічную хваробу, астэапароз, бясплоддзе, зніжэнне імунітэту, і шмат чаго яшчэ. Адначасова ў чалавека зніжаецца інтэлект. Пры гэтым многія рэчы, якія выклікаюць павышэнне картызолу, штучна створаныя.

***— У такім выпадку навошта нам скідваюць «картызолавыя бомбачкі» і ствараюць дафамінавыя пікі?***

— Тут трэба разабрацца ў двух тэрмінах — «свабодны раб» і «пакараныя краіны». Калі казаць пра свабоднае рабства, то гэта два несумяшчальныя, здавалася б, паняцці. Прынцып свабоднага рабства прыдумалі старажытныя егіпцяне. Іх эканоміка залежала ад рабства: калі рабы працуюць добра, эканоміка на пад'ёме, і наадварот. Рабаўладанне было ўзведзена на дзяржаўны ўзровень, і пастаянна трэба было вынаходзіць спосабы, каб людзі працавалі лепш. У гэты час было прыдумана свабоднае рабства: калі чалавеку ствараць ілюзію свабоды, у яго больш стымулаў выконваць свае функцыі хутка і якасна, чым пад прымусам.

У цяперашні час свет падзяляецца на развітыя краіны і тыя, якія развіваюцца. Новы сусветны парадак так пабудаваны, што падзяляе людзей на вышэйшых і ніжэйшых. Калі мы дзесьці хочам перавагі, іх трэба аднекуль узяць, а каб пазбавіцца ад праблем, іх трэба некуды «скінуць». Неабходна аднекуль узяць «мазгі», каб распрацаваць тэхналогіі, танную сыравіну, каб вырабіць тавары. І з-за гэтага краіны, якія развіваюцца, ніяк не могуць развіцца. Амерыка, напрыклад, збірае «мазгі» з усяго свету.



А праблемы развіцця дзяржавы «зліваюць» у «пакараныя краіны», ёсць такое паняцце ў дыпламатыі.

У палітыцы не бывае сяброўства, ёсць узаемавыгадныя адносіны. У дыпламатыі любы прадстаўнік павінен абараняць інтарэсы сваёй краіны, пры гэтым не шкодзіць інтарэсам іншай. Таму многія краіны выбіраюць, з кім сябраваць, з кім абмяжаваць сяброўства, і нават з кім ваяваць. Але гэта ў норме. У краін, якія працуюць на свабоднае рабства, гэтыя прынцыпы адсутнічаюць. І атрымліваецца, што адны краіны друкуюць грошы, тыя ж ЗША, а ў іншых — людзі іх адпрацоўваюць і нават сваю валюту вымяраюць у замежным эквіваленце.

Пасля пандэміі каранавірусу было надрукавана 1,4 трыльёна долараў, бо Амерыка хацела развіваць эканоміку, падтрымаць малы бізнес, сваіх грамадзян. А адпрацоўваюць гэтыя грошы «пакараныя краіны». У іх расце інфляцыя, яны павінны больш працаваць, каб зарабіць ранейшую зарплату. Хоць яны і лічаць, што працуюць на сваю краіну, насамрэч адпрацоўваюць надрукаваныя грошы. Гэта называецца новы сусветны парадак і свабоднае рабства, або сучаснае рабства.

Чаму Амерыка так сябе паводзіць? Калі ўрад краіны не ідэнтыфікуе сябе з жыхарамі гэтай краіны, гэта акупаваная краіна. ЗША — акупаваная краіна, бо ніхто з прэзідэнтаў на індзейцаў не падобны. Насамрэч карэнныя жыхары — індзейцы — нават не маюць сваіх кандыдатур на выбарах. Краіна, якая пачынае сваю гісторыю з акупацыі чужых народаў, будзе працягваць гэта рабіць увесь астатні час. І тут трэба зразумець, што ніхто краіну «пад ключ» нам не дасць. Усе развітыя краіны дабіліся дабрабыту сваімі рукамі (іншая справа — якімі спосабамі), немцы самі пабудавалі «мерседэс».

Як жа людзі пагаджаюцца на свабоднае рабства? Як сказаў Чэрчыль, у палітыцы няма нічога выпадковага. Сістэма пабудавана так, каб не з'явіўся новы Спартак, — гэта, канешне, не адзін чалавек, а асобныя краіны, якія не згодны з новым парадкам. Каб не з'явіліся абураныя людзі, іх галава павінна быць чымсьці занятая. Свабодны мозг вельмі таленавіты, пачынае прыдумваць новыя шляхі, ідэі, сэнсы. Калі мозг заняты «дафамінавымі ямамі», «картызолавымі бомбамі», пастаянна думае, як зарабіць грошы, каб набыць новы айфон ці БМВ, ён не будзе думаць, што адбываецца вакол. Чым больш выкідваецца таннага дафаміну і «картызолавых бомбачак», тым лягчэй людзі паддаюцца новаму сусветнаму парадку.

У многіх краінах зразумелі, што для падтрымання нацыянальнай бяспекі і гарантый будучыні патрэбна добрая адукацыя. Адукаваныя людзі ўстойлівыя да таннага дафаміну. Цяпер існуе негатыўная для новага пакалення тэндэнцыя, маўляў з адукацыяй вы не можаце дасягнуць сваіх мэт у жыцці, таму яна вам не надта і патрэбная. Вядома, гэта элемент інфармацыйнай вайны, і тут патрэбна супрацьвага. Неабходна тлумачыць моладзі, што добрая адукацыя дае добрую будучыню, эканоміку, бяспеку, бо такія людзі не паддаюцца чужому ўплыву.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# НАКРЫЕ ХВАЛЯЙ АПАДКАЎ

## На працягу тыдня чакаюцца парывісты вецер і моцныя лівні

**І гэта на фоне амаль 30-градуснай цеплыні, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак месцамі, раніцай і днём па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах — навальніцы, раніцай і днём па захадзе месцамі моцныя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі слабы туман.

Тэмпература паветра ўначы складзе 13—19 градусаў, а ўдзень — 23—29 цяпла. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

У сераду ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, днём месцамі моцныя. У асобных раёнах навальніцы, ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ад 12 да 18 цяпла, удзень — 21—28 градусаў.

І ў чацвер таксама дажджліва. У гэты дзень месцамі па краіне кароткачасовыя дажджы, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях часам і месцамі моцныя. У асобных раёнах навальніцы, ноччу і раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы ад 11 да 17 градусаў цяпла, удзень — 22—29 градусаў, на захадзе месцамі пахаладае да 20—21 градуса.

У пятніцу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 12 да 18 градусаў, удзень — ад 24 да 30 градусаў цяпла, а па захадзе — да плюс 21—23 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам сіноптыкаў, цёплае з кароткачасовымі дажджамі надвор'е захаваецца і ў выхадныя. Разам з тым ападкаў чакаецца няшмат, яны будуць адзначацца лакальна і месцамі суправаджацца навальніцамі. У суботу тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад 12 да 18 градусаў, а ўдзень — ад 23 да 30 цяпла. У нядзелю ўначы сіноптыкі абяцаюць 12—18 градусаў, а ўдзень — 25—31.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**

**Магазин – 756,5 кв. м,** инв. № 640/С-111245.

Адрес**: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, 98Д**

***Сведения о земельном участке**:* пл. **0,3632** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 28.12.2034) для обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В (пл. 0,0303 га)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 283 680,00 бел. руб.** (снижена на 40 %)

**Обременение:** площади магазина частично сданы в аренду

**Срок подписания договора купли-продажи:** **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати**) календарных дней после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2024

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.08.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 21.08.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

УНП 691522554

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, BELTORGI.BY

Продавец: **КПУП «Хойникский ремонтный завод»** (УНН 400056442) 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39, тел. +375 33 634 86 95.

Третьи повторные публичные торги будут проведены: **02 августа 2024 г. 11.00.**

Место проведения торгов: **г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, оф. 28**

### Комплекс имущества КПУП «Хойникский ремонтный завод» в составе:

Капитальное строение с инв. № 343/С-36804, площадью 1059,5 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад материально-технических ценностей. Адрес: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39/10.

Капитальное строение с инв. № 343/С-95739, площадью 322,5 кв. м, назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – покрасочный участок. Адрес: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39/9.

Капитальное строение с инв. № 343/С-95738, площадью 112,6 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад. Адрес: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39/16.

Информация о земельном участке: расположен на земельном участке с кадастровым номером 325450100001017964 общей площадью 0,7816 га. Право аренды. Срок аренды 25 лет.

Местоположение (адрес): Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. К. Маркса, 39/10,39/16,39/9.

Целевое назначение земельного участка: для строительства и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад материально-технических ценностей), здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад), здания обрабатывающей промышленности иного назначения (покрасочный участок).

В состав лота входят: кран-балка подвесная (инв. № 4521), 1974 г. в.; кран-балка подвесная (инв. № 4522), 1974 г. в.; крановые пути под кран-балку 330 м (инв. № 5027) (6 штук), 1974 г. в.

Начальная цена предмета торгов – 155 178,00 бел. руб. с НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра: +375336348695 .

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 23.07.2024 г. 09.00 по 01.08.2024 г. 16.00:

1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи 5 рабочих дней. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «Управление механизации №91», г. Минск, ул. Бабушкина, 17, пом. 3 |
| **Оператор/ Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1: складское помещение 13,3 кв. м** (архив), инв. номер 500/D-708004816, по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, 11-7д.** ***Обременение***: помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия; запрет на совершение регистрационных действий

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 25 600,00 бел. руб.**

**Лот № 2: грузовой седельный тягач MZKT 690610,** рег. знак AI 8486-7, 2010 г. в., по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 17

**Начальная цена лота №2 с НДС 20 % – 24 500,00 бел. руб.**

**Лот № 3: склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. № 500/С-13014095, общ. пл. 53,5 кв. м, по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48Ж. *Обременение:*** договор аренды.
***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. 0,0099 га принадлежит продавцу для эксплуатации и обслуживания здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ на праве аренды по 31.07.2032

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 56 400,00 бел. руб.**

**Лот № 4: площадка цементобетонная** (сооружение неустановленного назначения), инв. № 500/С-13015752, общ. пл. 4433,3 кв.м., по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48И.** Составные части и принадлежности: площадка, 4 ограждения, 2 ворот, 2 калитки.
***Обременение:*** договор аренды.
***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. 0.4519 га принадлежит продавцу для обслуживания сооружения неустановленного назначения на праве постоянного пользования. В состав лота входит иное имущество: дом бытовой 19

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 349 920,00 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней со дня завершения электронных торгов. Запрет совершения регистрационных действий будет снят продавцом в установленном законодательством Республики Беларусь порядке после проведения результативных торгов и подписания договора купли-продажи с победителем аукциона либо претендентом на покупку

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **7 %** от цены продажи лотов №№ 1–3, **5 %** от цены продажи лота № 4 в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.06.2024 по лотам №№ 1–2

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**по лотам №№ 1–2: с 11.00 до 12.00 07.08.2024;**
**по лотам №№ 3–4: с 11.00 до 12.00 23.08.2024.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.08.2024 (по лотам №№ 1–2), по 22.08.2024 (по лотам №№ 3–4) до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**Организатор торгов – частное предприятие «ПАКУМ» извещает о проведении четвертых повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Лестракинвест» со снижением начальной цены на 70 %.**

Аукцион состоится **01 августа 2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. | Задаток 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 6. | Водогрейный котел KOMKONT CH120; мощность 1,2 МВт; год выпуска 2018; новый; полный комплект | 61 200,00 | 3 060,00 | 3 060,00 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «Лестракинвест», +375291307853 |
| **Организатор торгов** | Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, +375293321936 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, БИК ALFABY2X4 р/с BY72 ALFA 3012 2E32 2100 1027 0000 в ЗАО «АЛЬФА-БАНК», г. Минск |

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в срок до 15.00 31.07.2024 г.
Подробная информация о составе лота на сайте pakum.by.
Осмотр лота в рабочие дни с 9.00 до 15.00, тел. +375291307853.
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте организатора аукциона – https://pakum.by

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95. УНП 600017855 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов – оборудование, бывшее в употреблении**
Местонахождение: Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 95, 107

| № лота | Инв. номер | Наименование оборудования | Модель оборудования | Начальная цена без учета НДС* бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 9020260 | **Координатно-расточной станок 1986 г. в.** | 24К40СФ-4 | **10 604,35** |
| 2 | 9060161 | **Вертикально-фрезерный станок 1985 г. в.** | 6Т10 | **10 401,51** |
| 3 | 9040123 | **Электроэрозионный станок 1984 г. в.** | 4Д722АФ-1 | **9 773,04** |
| 4 | 9020209 | **Вертикально-сверлильный станок 1982 г. в.** | 2Н150 | **3 044,25** |
| 5 | 9020187 | **Вертикально-сверлильный станок 1980 г. в.** | 2Н135 | **2 324,25** |
| 6 | 9060130 | **Вертикально-фрезерный станок 1980 г. в.** | 6Р13 | **40 745,57** |
| 7 | 9060148 | **Спец. горизонтально-фрезерный станок 1970 г. в.** | ГФ 1362 Н1 | **3 764,25** |
| 8 | 9060224 | **Вертикально-фрезерный станок 1996 г. в.** | FSS400 | **14 441,07** |

**Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС, либо, по согласованию с продавцом, с нулевой ставкой НДС при экспорте товаров в государства-члены ЕАЭС*

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by и электронной площадке ИПМ-Торги www.ipmtorgi.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 2,9 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 23.05.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.08.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.08.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

**Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № 2024.Г.002.00082 по продаже государственного имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.**

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 07.08.2024 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Продавец:** РУП «Витебское племпредприятие».

**Лот № 1.** Принтер MARKEM-IMAGE 9405, 2017 г. в., серийный номер FR17310177, инв. № 1104, находящийся по адресу: г. Витебск, пер. 1-й Шумилинский, 1.

**Нач. цена: 1020,00 бел. руб. без учета НДС.**

Срок внесения задатков и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам**: до 16.00 06.08.2024.**

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу **www.gki.gov.by** в разделе: Главная/Бизнесу/ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА/Движимое имущество.

УНП 390477566

# Першымі ў Гродна ўвайшлі сапёры

## Былая санінструктар расказала, якім убачыла горад у ліпені 1944-га

**Зінаідзе Судаковай было 18 гадоў, калі іх сапёрны батальён падышоў да Гродна — аднаго з самых буйных чыгуначных вузлоў і ўмацаванага раёна абароны немцаў. Было вядома, што будынкі замініраваны. Нямецкаму камандаванню паступіў загад з Берліна поўнасцю знішчыць горад. Ворагу ўдалося ўзарваць аўтамабільны мост праз Нёман. Таму ў ліку першых у горад 16 ліпеня ўвайшлі сапёры 1-й Гвардзейскай Магілёўскай асобнай інжынерна-штурмавой брыгады для размініравання шматлікіх аб'ектаў, якія былі падрыхтаваны да выбуху. Гэта дазволіла правесці аперацыю хуткімі тэмпамі і выратаваць горад ад знішчэння.**



Фота з адкрытых крыніц.

Зводкі тых часоў перадаюць, што ў ходзе аперацыі «Баграціён» войскі 2-га і 3-га Беларускіх франтоў 16 ліпеня 1944 года штурмам авалодалі горадам Гродна. Менавіта ў гэты дзень прагучалі артылерыйскія залпы ў Маскве ў гонар вызвалення горада-крэпасці. Але гэта была не канчатковая перамога. Калі цэнтральная частка горада была вызвалена за тры дні, занёманскі бок немцы трымалі да 24 ліпеня. Адышоўшы на левы бераг, захопнікі пакінулі пасля сябе адны руіны. Захаваліся дакументальныя кадры кінахронікі 1944 года з архіўных фондаў, на якіх можна ўбачыць амаль поўнасцю знішчаны цэнтр.

Менавіта такім убачыла горад і ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнка Разані Зінаіда Судакова. Сёлета ёй споўніцца 99 гадоў, а ў 1943-м яна семнаццацігадовай дзяўчынай па камсамольскай пуцёўцы пайшла на фронт санітарным інструктарам. Яе сапёрны батальён уваходзіў у склад 2-га Беларускага фронту падчас наступальнай аперацыі «Баграціён». З баямі часці ішлі ў наступленне. Праз год яна апынулася пад Гродна. Сапёры першымі ўвайшлі ў горад, каб ачысціць яго ад мін. Была дадзена каманда зрабіць пераправу праз Нёман, дзе на другім беразе замацаваліся нямецкія войскі.

Вырашылі арганізаваць пантоны ля старога моста, на месцы сучаснага пляжа, бо там былі самы пакаты схіл. Немцы з другога берага пастаянна абстрэльвалі пантоны і плыты, якія разам з байцамі ішлі пад ваду. Жанчына кажа, што вада была чырвонай ад крыві. Баі ішлі некалькі дзён. Немцы бясконца абстрэльвалі правы бераг, білі з пушак, зенітак, таму наладзіць пераправу было вельмі складана. «Не забуду подзвіг групы разведчыкаў, якія паспелі перабегчы на другі бераг па чыгуначным мосце — яны не ведалі, што ён замініраваны. Немцы яго ўзарвалі, і байцы апынуліся ў пастцы. Яны адстрэльваліся да апошняга патрона і гераічна загінулі», — з горыччу кажа жанчына.

Успамінае, што баі за Гродна пачаліся на подступах 15 ліпеня і працягваліся ўсю ноч. Да раніцы ўдалося выбіць немцаў з цэнтральнай часткі горада. У памяць урэзаліся разбурэнні, у прыватнасці чырвонага касцёла — Фары Вітаўта з пашкоджанай чарапіцай. Даведалася, што там немцы расстрэльвалі яўрэяў гродзенскага гета. За трывалай сцяной храма была разбіта медыцынская палатка сапёрнага батальёна. А літаральна ў сотнях метраў вяліся баі за вызваленне занёманскай часткі горада. Немцы ўзарвалі мост і аказвалі вельмі жорсткае супраціўленне. Савецкая плошча з разбуранымі дамамі амаль поўнасцю прастрэльвалася. «Наш медпункт ужо не змяшчаў параненых, таму нам загадалі перабрацца ў адзін з ацалелых будынкаў на вуліцы Замкавай. У ім уся падлога на першым паверсе адразу запоўнілася паранёнымі байцамі, якіх мы, шасцёра маладых сясцёр-санінструктараў, выцягвалі на насілках ці на брызенце. Іх укладвалі перад ваенным урачом, які бесперапынна імі займаўся», — успамінае Зінаіда Цімафееўна.

...Жанчына шмат гадоў прыходзіць падчас урачыстых мерапрыемстваў да Вечнага агню, які гарыць у парку Жылібера ля брацкай магілы. Яна памятае гэта месца ў ліпені 1944 года. Сюды адусюль прыносілі загінулых воінаў і апускалі на брызенце ў агульную магілу. Аднойчы яе таксама адправілі дапамагаць у пахаванні. Да гэтага часу яна не можа забыць маладыя, прыгожыя, але мёртвыя твары загінулых пры вызваленні горада. Яны паўстаюць перад яе вачыма кожны раз, калі яна прыходзіць да брацкай магілы. Помнік на ёй быў адкрыты 1 мая 1949 года, а пасля яго рэканструкцыі ў 1984 годзе тут запалілі Вечны агонь.

Ветэран зноў вяртаецца ў той час, калі раніцай 17 ліпеня 1944 года ім аб'явілі, што ў гонар вызвалення крэпасці Гродна — так значылася ў загадзе Сталіна — напярэдадні вечарам у Маскве быў дадзены салют 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат. Але фашысты з другога высокага берага Нёмана працягвалі абстрэлы цэнтра горада. Тады сапёрны батальён паехаў будаваць пераправу за трыццаць кіламетраў ад Гродна. Яе ўзводзілі пад пастаяннымі бамбёжкамі варожых самалётаў. «Мы, медыкі, занялі вялікі драўляны дом у найбліжэйшай вёсцы. Як і ў Гродне, ён хутка быў запоўнены параненымі байцамі. Гэта быў сапраўдны канвеер. Дзяўчаты-санінструктары ледзь паспявалі іх перавязваць, не хапала медыкаментаў, бінтоў, у ход пайшла бялізна. Было шмат загінулых, балюча гэта ўспамінаць, але наша моладзь павінна ведаць, як складана дасталася нам Перамога», — лічыць Зінаіда Судакова.

Сапёры ўсё ж зладзілі пераправу, па якой усе часці пераправіліся на левы бераг і з тылу падышлі да ворага. Такі манеўр дазволіў 24 ліпеня выбіць немцаў з занёманскага боку. Такім чынам, вызваленне Гродна цягнулася больш за тыдзень.

Са сваім сапёрным батальёнам санінструктар Судакова прайшла ўсю Беларусь. Запомніўся і такі эпізод. Пад Бабруйскам зайшлі ў адну з партызанскіх вёсак, адкуль даносіліся страшныя крыкі: гарэла вясковая лазня, куды немцы пры адступленні сагналі мясцовых жыхароў і падпалілі.

Памятае, як ратавалі і перавязвалі абпаленых людзей. Там, пад Бабруйскам, у адным з баёў Зінаіда Судакова была паранена разрывам гарматы. Але лячыцца не было часу, сяброўкі зрабілі перавязку, крыху адышла і зноў узялася за справу. А той асколак да гэтай пары сядзіць у галаве.

Вайна для яе скончылася ў Берліне. Батальёну быў дадзены загад вяртацца назад. У арміі яна сустрэла сваё каханне — старшага лейтэнанта Мікалая — і выйшла за яго замуж. Усе яго родныя загінулі ў блакаду Ленінграда, і яны вырашылі застацца жыць у Гродне. Сюды якраз перавялі іх сапёрную часць, дзе Зінаіда Цімафееўна яшчэ нейкі час служыла малодшым сяржантам медыцынскай службы. Пасля дэмабілізацыі працавала на вытворчасці, а па выхадных днях гараджане выходзілі на расчыстку руін. Пасля вызвалення з 60 тысяч жыхароў у жывых засталася толькі трэцяя частка. Падчас баёў было разбурана 43 працэнты будынкаў.

Там, дзе цяпер прыгожая Савецкая плошча, было поле з бітай цэглы. Гараджане збіралі яе рукамі. Але ўсе імкнуліся хутчэй аднавіць горад, быў асаблівы пад'ём. Дзякуючы намаганням такіх, як Зінаіда Судакова, горад паступова набываў мірны выгляд. Сёння гэта сапраўдная жамчужына Беларусі.

Гродна стаў родным для жанчыны-ветэрана. Тут жыве ўся яе вялікая сям'я — дзеці, унукі, праўнукі. Праправўнук сёлета скончыў школу. «Вельмі хочацца жыць у міры. Жыццё стала камфортным і стабільным, горад з кожным годам прыгажэе. Сёлета мне споўніцца 99 гадоў, вельмі хочацца сустрэць тут 100-гадовы юбілей», — не хавае эмоцый Зінаіда Цімафееўна.

На святочныя мерапрыемствы яна прыходзіць з узнагародамі — ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы», «За ўзяцце Вены» і іншымі. Яе імя занесена ў Кнігу славы горада і вобласці. Ветэран Судакова, жанчына нялёгкага ваеннага лёсу, лічыць сябе шчаслівым чалавекам. І хоць успаміны пра вайну вельмі балючыя, яна не адмаўляецца расказваць аб тых падзеях сваім нашчадкам, каб яны таксама выраслі патрыётамі роднай краіны.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «Чалавечае жыццё для фашыстаў не мела каштоўнасці»

## Ніхто не забыты: гісторыя аднаго салдата



Фота з асабістага архіва.

**Старая, даўно пажоўклая фатаграфія моцна вылучалася на фоне пазнейшых здымкаў, што акуратна размясціліся ў сямейным альбоме, і таму адразу прыцягнула маю ўвагу:**

**— Дзядуля, хто гэта?**

**— Дзе?**

**Нядоўга пашнарыўшы па кішэнях, ён знайшоў акуляры, уважліва паглядзеў на фота і ціха адказаў:**

**— Твой прадзед, Века Іван Васілевіч.**

Памятаю, як раптам стала сорамна. Я, праўнучка салдата, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, да гэтага моманту не ведала нават яго імя. І, калі задумацца, то памяць пра шматлікіх людзей, якія перажылі той цяжкі час, амаль адышла ў нябыт. Безумоўна, незаслужана. Аднак выправіць гэта можна, запісваючы іх гісторыі, згадваючы іх лёсы са слоў родных і блізкіх. Я пачну з той, што ўтойвае ў сабе знойдзены ў альбоме фотаздымак. З гісторыі, якая беражліва захоўвалася ў памяці майго дзядулі, названага ў гонар бацькі — таксама Іванам.

Нарадзіўся Іван Васілевіч у 1921 годзе ў сялянскай сям'і. Меў брата Паўла, а пасля на свет з'явіўся яшчэ адзін сын — Мікалай. Іх бацька, былы ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, вярнуўся дадому цяжка параненым і пражыў з-за хваробы не вельмі доўга. Вайна застала майго прадзеда, тады яшчэ юнака з вёскі Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна, пад Смаленскам, калі хлопцу не было і дваццаці гадоў.

— Спачатку мой бацька быў танкістам, — пачаў свой расповед дзядуля. — Расказваў, як адной раніцай не сціхаў бой. Боепрыпасаў не хапала, на станцыю павінен быў прыйсці эшалон з усім неабходным. Аднак, пачаўшы разгружаць вагоны, салдаты ўбачылі ў іх зусім не тое: дошкі і мыліцы не абароняць іх ад куль і снарадаў... Немцаў доўга чакаць не прыйшлося. Фашысты амаль што тапталіся па целах забітых, а тых, што засталіся ў жывых, загналі ў вагоны і павезлі ў Германію.

Не паспеў прадзядуля паваяваць, як трапіў у палон. Працаваць на адну нямецкую сям'ю выпала з земляком-беларусам. Жудасныя, бесчалавечныя адносіны да сябе яны перажывалі разам:

— Аднойчы сын гэтых немцаў (ён быў ваенны) адвёў іх дваіх у сад,аднаму і другому наклаў на галовы яблыкі — хацеў пастраляць. На шчасце, своечасова вярнуўся дадому яго бацька і выратаваў хлопцаў. Калі б той не паспеў, зразумела, што здарылася б... Чалавечае жыццё для фашыстаў не мела каштоўнасці.

Тым часам, нягледзячы на ўсе тыя цяжкасці, што прыйшлося пераадолець, мой прадзядуля разам з іншымі ваеннапалоннымі ўцёк з Германіі. Беглі праз палі, лясы, хаваліся ад сабак, якія ішлі па іх следзе. Нарэшце атрымалася вярнуцца да сваіх. Зноў узяўшы ў рукі зброю, Іван Васілевіч працягнуў бараніць Радзіму.

— Пасля палону майму бацьку давялося працаваць вадзіцелем, таму ён даволі часта сустракаўся з рознымі высокапастаўленымі асобамі: Ракасоўскім, Коневым і іншымі. Так і дайшоў да Германіі, — распавядае дзядуля.

За гады вайны прадзядуля паспеў перажыць многае. Чуў, як крычалі ад болю яго сябры і таварышы, пасля разрыву снарадаў. Бачыў, як людзі ратавалі сябе і сваіх дзяцей ад немінучай гібелі. Адчуваў, як кожная клетачка цела ўздрыгвае ад злосці і нянавісці да ворага. Вызваляў Польшчу, Венгрыю, Аўстрыю, Чэхаславакію, сустрэў Перамогу слязамі шчасця і радасці... І маўчаў пра гэта доўгія гады:

— Тады як было: нам, дзецям, нічога не расказвалі. Малыя, што з іх узяць, яшчэ прабалбочуцца, што бацька ў палоне быў, ды яшчэ і вярнуўся здаровым. Маглі палічыць за здрадніка... Пра раненні, шрамы ад сабачых укусаў, атрыманыя падчас уцёкаў, ніхто б слухаць не стаў.

Пасля вайны Іван Васілевіч вярнуўся на сваю малую радзіму і ўладкаваўся ў мясцовае лясніцтва. Скончыў вучылішча. Увогуле, за доўгае жыццё мой прадзядуля шмат кім паспеў папрацаваць: экскаватаршчыкам, меліяратарам, кранаўшчыкам, аб'ездным вартаўніком. Са сваёй будучай жонкай Іван пазнаёміўся ў краме, дзе тая была прадаўшчыцай. У шчаслівым шлюбе даўжынёю ў жыццё нарадзілася чацвёра дзяцей — Ніна, Іван, Анатоль і Валерый.

Былі і ордэны, і шматлікія медалі. Напрыклад, у гонар 40-годдзя Вялікай Перамогі над фашызмам Іван Васілевіч як ветэран быў узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны II ступені, ён вельмі ім ганарыўся. На жаль, ні гэта, ні іншыя ўзнагароды не захаваліся да нашага часу.

— Татка чапляў ордэн, як належыць, на правы бок грудзей, кожны год на 9 Мая, — успамінае дзядуля. — І кожны раз на яго вачах блішчалі слёзы. Насамрэч гэтае свята было асаблівым для ўсіх — жыло яшчэ ў памяці народа, якімі намаганнямі і ахвярамі дасталася яму Перамога.

**Аміна НАЗАРАВА.**

# ЛЯ СЦЕН СТАРАЖЫТНАГА ХРАМА

## Як здымаецца дакументальны фільм пра Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр і яго заснавальніцу



У наступным годзе адбудзецца знакавая падзея: дзевяць соцень гадоў таму ў Полацку, калысцы беларускай дзяржаўнасці, святой прападобнай Еўфрасінняй Полацкай быў заснаваны манастыр. Ён, Спаса-Еўфрасіннеўскі стаўрапігіяльны жаночы, сёння застаецца цэнтрам духоўнага прыцягнення. Туды прыязджаюць паломнікі не толькі з усіх куткоў Беларусі, але і з усяго свету. Тут не толькі праваслаўная святыня, тут захаваліся ўнікальныя ўзоры архітэктуры і мастацтва XII стагоддзя сусветнай каштоўнасці. Не дзіўна, што юбілейныя мерапрыемствы з нагоды 900-годдзя святыні пачаліся яшчэ з мінулага года. Канферэнцыі і круглыя сталы, выставы і фестывалі, мастацкія пленэры і публікацыі ў прэсе, тэле- і радыёперадачы, навуковыя даследаванні... Не засталіся ўбаку ад падзеі і беларускія кінематаграфісты. На студыі «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» здымаецца дакументальная стужка «Прыстанак святой Еўфрасінні». Яе рэжысёр, Уладзімір Луцкі, на леташнім кінафестывалі «Лістапад» атрымаў спецыяльны прыз журы конкурса дакументальнага кіно за фільм «Лахва. Цана свабоды» пра паўстанне вязняў гета ў беларускай вёсцы. Раней за стварэнне серыі дакументальных фільмаў «Хроніка Мінскага гета» Уладзімір быў узнагароджаны Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Увогуле ён аўтар шматлікіх кінастужак пра дзеячаў беларускай гісторыі. Якія мэты ставіць рэжысёр, узяўшыся за фільм пра полацкі прыстанак?

— Першапачатковую ідэю давялося карэкціраваць, — прызнаецца Уладзімір. — Хацелася зрабіць вобразна, з элементамі ігравога кіно. Але ў працэсе супрацы з манастыром канцэпцыя памянялася. Я прыслухаўся да пажаданняў, якія прагучалі, мы перарабілі сцэнарый. Фільм будзе разлічаны на шырокую глядацкую аўдыторыю, каб было цікава і дзецям, і дарослым. Мы хочам расказаць гісторыю жыцця святой прападобнай Еўфрасінні на фоне падзей, якія адбываюцца ў манастыры сёння, паказаць унутранае жыццё манастыра.

**— Звычайна падобная праца знаходзіць цябе невыпадкова...**

— Так. Калісьці даўно мы з жонкай Ірынай былі ў Полацкім манастыры і трапілі на ранішнюю службу. Убачанае вельмі ўразіла. Абсалютная ціша... Гараць свечкі. Бясшумна ўваходзяць манахіні. Гэтая ўразлівая чысціня і цішыня... Песнапенні... Усё гэта доўга не пакідала мяне. І цяпер мы паспрабавалі з аператарам Максімам Куроўскім гэту чысціню манастырскую ўлавіць. Не ведаю, ці атрымалася... Некаторыя кадры мне падабаюцца. Часам было вельмі складана працаваць, таму што нам не хацелася парушаць распарадак манастыра, сутнасці гэтага жыцця. Мы намагаліся працаваць акуратна, далікатна. Калі фільм выйдзе, стане зразумела, удалася нам наша задума ці не, атрымалася ці не распавесці гледачу, хто такая Еўфрасіння Полацкая для Беларусі, якія ўрокі яна для ўсіх нас пакінула. Дарэчы, ігумення манастыра матушка Еўдакія заўважыла, што фрэскі, якія знаходзяцца ў Спаса-Праабражэнскім храме манастыра, што ўзведзены пры жыцці святой, гэта і ёсць пасланне прападобнай Еўфрасінні нашаму пакаленню. Там шмат зашыфравана, і, напэўна, не адно дзесяцігоддзе яшчэ пройдзе, каб гэта расшыфраваць. Дзякуй богу, што фрэскі раскрыліся і яны ў добрай захаванасці. Вельмі ўразіў нас від манастыра, калі мы падняліся на дах. Гэтыя схілы дахаў, гэтыя муры дванаццатага стагоддзя, якія мы ўбачылі... Нібы дыхаеш паветам таго стагоддзя... Амаль містычная рэч, якую не раскажаш — гэта трэба адчуваць.

**— Перад гэтым у вас было шмат фільмаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны...**

— Так, нават не магу зараз палічыць. Усяго, напэўна, я зняў каля паўтары сотні фільмаў, і большая частка — на тэму Вялікай Айчыннай. Калі я працаваў у Маскве, на канале РЕН-ТВ, там шмат было ваеннай тэмы. У 2013 годзе мне пашчасціла на Студыі гістарычнага кіно Уладзіміра Бокуна зрабіць фільм «Хроніка Мінскага гета», потым яшчэ шэраг фільмаў. Тэма сама да сябе паклікала. Часам ты не разумееш, чаму бярэшся за тую ці іншую тэму. Проста быццам цябе абралі для гэтага нейкія вышэйшыя сілы. Творчасць я ўвогуле разглядаю не як вынік разумовых рашэнняў. Часам фільм нават па-за тваёй воляй пачынае нараджацца сам, і ты ідзеш услед за ім. Такія рэчы мяне часта здзіўляюць, але я навучыўся прымаць гэта. Здараецца, на здымках маеш добры план, хочаш яго рэалізаваць, але раптам з'яўляецца нешта зусім здзіўляючае, ты павінен ісці за гэтым, і адкрываеш такія глыбіні... Ну вельмі цікавая прафесія — рэжысёр, і я шчаслівы, што дзякуючы ёй сутыкаюся з вялікай колькасцю цікавых людзей, як вось цяпер, у манастыры. Гэта і матушка ігумення Еўдакія, і сястра Кіра, якая шмат дапамагае нам, і сястра Міра, і сястра Рахіль, і астатнія сёстры...

**— Вы адразу звярнуліся ў манастыр, калі ўзяліся за праект?**

— Вядома. Перад пачаткам здымкаў групай паехалі браць благаславенне ў матушкі ігуменні, атрымалі яго, і вось цяпер працуем з дапамогай манастыра. Памятаю і першы дзень здымкаў. Пачалі здымаць першую сцэну, размясціліся — а гэта было ў храме. Аператар здымае, ідзе служба... І раптам сястра Кіра нас па чарзе пачынае падводзіць да мошчаў святой прападобнай Еўфрасінні. Раку адкрылі, звычайна ж яна прыкрытая шклом. Гэта было вельмі ўразліва, запамінальна і вельмі паўплывала на нас.

**— А што падчас здымкаў здзівіла так, што давялося мяняць планы?**

— Гэта здарылася ў перадапошні дзень здымкаў. Я шмат бываў у манастырах. Але падобнага не бачыў. Мы збіраемся з'язджаць, і раптам выходзіць да брамы манахіня з доўгай дошкай і драўляным малаточкам. Я ў разгубленасці — што зараз будзе? І тут яна пачынае біць тым малаточкам у дошку і хутка хадзіць у розных напрамках. Я пабег за аператарам, але ён, на жаль, не паспеў зняць тую манахіню... Я ўдакладніў, што гэта было, таму што нічога падобнага ніколі не бачыў, і ўздзеянне, якое відовішча робіць, проста ўнікальнае. Мне патлумачылі, што такім чынам у нядзельныя і святочныя дні манашкі, часам адна, часам некалькі, абыходзяць манастыр і склікаюць насельніц на службу. Гэтак жа, як Ной калісьці склікаў стварэнняў Божых на каўчэг. Я вырашыў, што гэта абавязкова павінна быць у нашым фільме. Раніцай мы прыехалі з групай у патрэбны час і гэты момант знялі.

Яшчэ быў адзін падобны момант... Я разумеў, што для фільма не хапае нейкага складніка. Здаецца, і ў сцэнарыі ўсё прапісана, а чагосьці няма... І раптам бачу — прывялі дзяцей на экскурсію, і экскурсавод распавядае ім гісторыю Еўфрасінні. Я разумею: мяне як бы спецыяльна туды падвялі, бо я ж не збіраўся ісці ў тое месца. І яшчэ разумею: гэтая сцэна павінна ўвайсці ў фільм. Складана было здымаць: шмат людзей, старонніх гукаў, тым не менш мы знялі, я цяпер гляджу на тую сцэну, і бачу, што гэта правільнае рашэнне.



**— На час здымкаў прыпалі якія-небудзь царкоўныя святы?**

— Мы не ставілі мэты здымаць іх, хоць у манастыры часта адбываюцца ўрачыстыя службы. Але мы здымалі ў асаблівы дзень — дзень матушкі Еўфрасінні, святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай, які адзначаецца 5 чэрвеня. У гэты дзень у манастыр з'язджаюцца паломнікі, царкоўныя іерархі, хросны ход ідзе праз увесь горад... Мы планавалі гэтую падзею на фінал фільма. Вельмі складана здымаць такія рэчы, бо агромністая колькасць людзей, і для аператара якасна зняць, выставіць фокус, змясціць у патрэбны пункт камеру ў такіх умовах немагчыма. Давялося працаваць, як рэпарцёрам, бегаць з камерай, знаходзіць цікавыя фрагменты. А падзею ж нельга паўтарыць! Здымкі такіх сцэн патрабуюць шмат высілкаў і падрыхтоўкі, але мы зрабілі гэта.

**— У фільме задзейнічаныя навуковыя эксперты?**

— Так. Напачатку планавалі ўдзел некалькіх экспертаў, але пасля вырашылі, што пра святую Еўфрасінню і гісторыю манастыра найлепей распавядуць сёстры манастыра і матушка Еўдакія. У той час, як мы здымалі фільм, адбывалася рэстаўрацыя ў Спаскім храме. Ёй кіруе архітэктар-рэстаўратар з Санкт-Пецярбурга Сяргей Лалазараў — вельмі глыбокі чалавек, які тонка адчувае сваю прафесію, беражліва ставіцца да спадчыны. У інтэрв'ю гэта будзе відаць, бо Сяргей Валяр'янавіч і з'яўляецца ў нашым фільме як эксперт. Сустрэча з такімі людзьмі — узнагарода, таму што ты дакранаешся да чагосьці вельмі глыбокага і важнага.



**— На якой мове выйдзе фільм, калі яго можна будзе ўбачыць?**

— Рыхтуюцца дзве версіі: беларускамоўная і рускамоўная. Дыктарскі тэкст агучыць заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі. Музыку піша вядомы кампазітар Уладзімір Сівіцкі. Зараз ідуць завяршальныя працэсы работы. Убачыць гатовую стужку можна будзе ўвосень. Фільм — складаная канструкцыя, ніколі не ведаеш, атрымаецца ён ці не. Сёстры Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра кажуць, што ўсё па волі прападобнай. Калі будзе яе воля, фільм атрымаецца добры. Мы стараліся. Глядач цяпер «нагледжаны», ён вельмі шмат бачыў. А кожны фільм павінен нечым здзіўляць. Паспрабуем і мы.

**Людміла ІВАНОВА.**

# РЭСТАЎРАЦЫЯ ПАМЯЦІ

## Складнікі творчасці Ільі КІР'ЯНАВА



**Вы не задумваліся, як мяняецца свет? Віртуальныя зносіны падмяняюць рэальныя. Мы тонем у гігабайтах інфармацыі. У сучасных рытмах і хуткасцях перастаем задавацца пытаннямі пра сэнс жыцця. У нашых стужках мільгаюць чужыя, пустыя людзі, якія прыгожымі «відосікамі» рэкламуць сваё «паспяховае», але такое марнае, нікчэмнае жыццё. Рэальна становіцца страшна. Міжволі задаешся пытаннем «А што далей?». Як не даць нашым дзецям правaліцца ў гэтую чорную халодную дзірку, навучыць думаць, марыць, суперажываць, бачыць прыгожае... Менавіта з такіх пытанняў я і вырашыла пачаць гутарку са скульптарам Ільёй Кір'янавым. Чалавекам, чыя творчасць звязана з верай. Пэўны час ён працаваў у майстэрні пры Свята-Елісавецінскім манастыры, а сёння займаецца рэстаўрацыяй сакральных прадметаў у аддзеле старажытна-беларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.**

— Днямі злавіў сябе на думцы, як многа мы сталі страчваць, — прызнаўся Ілья. Мы проста з дзеткамі каталіся на коніках. Адчуванне было, быццам да цябе вярнулася нешта жывое, адразу стала так лёгка, цёпла. Сучасны свет адбірае гэта, віртуальныя навароты «высмоктваюць» нас. Сапраўды, з'явілася шмат негатыву, небяспек. Гэта адчуваеш, нават калі проста глядзіш на людзей на вуліцы. Яны перасталі прымаць сябе, цаніць. Штосьці падаецца нават глупствам, напрыклад татуіроўкі на дзяўчатах ці штучныя, ва ўсіх аднолькавыя «пельмешкі» замест вуснаў...

***— Як лічыце, мастацтва здольнае ад гэтага вылечыць?***

— І не толькі ад гэтага. Яго сілу цяжка ацаніць. Нездарма ж раяць нават эканамістам і людзям, якія звязаны з дакладнымі навукамі, займацца творчасцю. Мастацтва дапаможа ўзвысіць розум. Яно павінна служыць людзям. Натхняць, узвышаць над паўсядзённасцю, ад якой усе стамляюцца. А прыгажосць побач, творы могуць ажывіць чалавека. На жаль, сёння шмат такога мастацтва, якога, на мой погляд, лепш бы не існавала. Не магу зразумець, як рэжысёры ствараюць фільмы, дзе кроў ліецца ракой. Як можна з гэтым жыць? Любая творчасць — гэта тое, што прапускаеш праз сябе.

***— Ці перашкаджаюць творцам сучасныя тэхналогіі: як ствараць, калі ідзе «бамбаванне» ідэямі з усяго свету?***

— У нечым яны могуць дапамагаць. Так, ёсць праграмы і станкі, якія ствараюць скульптуры з любога матэрыялу. Але ў іх няма таго, што ёсць у работах чалавека, ён іх адухаўляе. Калі пэўны час не бачыш сваю скульптуру, а пасля вяртаешся да яе, ізноў перажываеш тыя эмоцыі, якія былі, калі яе рабіў, якія ўклаў. Гэта як частка тваёго жыцця. Нельга забывацца, што ёсць тое, што закладваецца ў чалавека Творцам, дзякуючы чаму ён можа гарманічна развівацца.

### ВЕРА

***— Напэўна, варта ўзгадаць, што развіццё мастацтва, культуры было звязана з манастырамі. Там былі кнігі, іканапіс, ствараліся цудоўныя архітэктурныя творы...***

— У манастыры я сустракаў шмат людзей, які закончылі мастацкую акадэмію. Гэта прызванне таксама даецца звыш. Чалавек імкнецца да высокага. Там разумеш, што ёсць іншы свет, ёсць вечнасць. Гэта дазваляе сысці ад штодзённасці; зразумець, што з'яўляецца галоўным.Такім адкрыццём людзі імкнуцца падзяліцца праз мастацтва, музыку, літаратуру...

***— Можна сказаць, што вас мастацтва прывяло да храма?***

— Думаю, што прывёў Гасподзь. Калі азіраюся на жыццё, разумею, што была нейкая вышэйшая сіла, якая заўсёды аберагала, настаўляла. Чаго я толькі ні паспрабаваў у жыцці, куды мяне ні кідала, дзе я толькі ні шукаў адказаў, а пра праваслаўе нават не думаў. Але былі цуды, якія змянілі мяне, напрыклад, падчас паездкі ў Пскова-Пячорскі манастыр. У дарозе я падвярнуў нагу, магчыма, парваў звязкі. Нага апухла, моцна балела, я ледзьве кульгаў. Калі я акунуўся ў цудатворнай Сава-Крыпецкай крыніцы, нават не адразу заўважыў, што ўжо не кульгаю. А хіба гэта не цуд, калі падчас службы ў пячоры ад манахаў, якія маліліся, ішло свячэнне? Дзіўна і тое, як адчуваеш сябе пасля службы. Раптам становіцца лёгка, усе людзі падаюцца прыгожымі, светлымі. Я хрысціўся ў 2001 годзе, калі рыхтаваўся да гэтай падзеі, чытаў царкоўныя кнігі. Адчуванне было, што чытаў пра сваё жыццё. Аказалася, нічога не бывае проста так. Усе папярэднія няўдачы, сумненні былі заканамернымі.

***— Атрымліваецца, адказы на многія пытанні, якія людзі шукаюць усё жыццё, даўно ўжо знойдзены. І ўсё ж чаму вы прыйшлі ў храм, нават кінулі вучобу ў Акадэміі мастацтваў, хацелі стаць манахам?***

— Я ўбачыў гэтую прыгажосць, свабоду манаскую. Цяжка перадаць, што я там перажываў. Нідзе не адчуваў такой радасці быцця. Вы бачылі вочы манахаў? Пасля паездкі ў Пскова-Пячорскі манастыр я вяртаўся зусім іншым чалавекам. Я нават баяўся ў нядзелю ў храм не пайсці, вечарам лёгчы спаць без малітвы. Многія, хто прыходзіць да веры, спачатку вядуць сябе дзіўна. Мне так цікава быў іншы лад жыцця, манаскі, што астатняе быццам стала неістотным. Але аказалася, што тое, ад чаго я хацеў адмовіцца дзеля Бога, аказалася патрэбным яму. У манастыры я займаўся скульптурай. Мая маці перажывала, што я кінуў вучобу, напісала Уладыку Філарэту (Вахрамееву). І ён, нягледзячы на сваю занятасць, знайшоў для мяне час — сказаў, што трэба аднаўляцца ў акадэміі, бо так я змагу больш прынесці карысці Царкве. Так я застаўся паслушнікам і займаўся скульптурай у манастыры. Я разумеў, што гэта мае прызванне і што яно ўгодна Богу. А яшчэ тут сышлі ганарлівыя думкі наконт таго, што ты павінен з сябе ўяўляць; сумненні, што нешта вялікае не атрымаецца. Тут я не стаўіў перад сабой задачу скарыць свет, а проста спакойна працаваў і бачыў, што людзям падабаецца тое, што раблю. Гэта натхняе, надае сіл і жадання працягваць займацца творчасцю.

***— Адкуль бяруцца праблемы пошуку і сумненняў? Як творчым людзям перамагчы гэтае пачуццё залішняй патрабавальнасці да сябе?***

— Ёсць шмат унутраных перашкод. Пакуль не акунуўся ў іншы свет, у манастырскае жыццё, і ў мяне было шмат пакут. Падавалася, што павінен быць прафесіяналам. Сапраўды, гэта цяжка, калі бачыш узоры вялікіх мастакоў, напрыклад, часоў антычнасці, і разумееш, што так не можаш зрабіць. Адсюль і думкі кшталту: калі няздольны, навошта брацца. Насамрэч мастацтва — гэта і карпатлівая, штодзённая праца. Калі ім займаюцца з маленства, людзі не заўважаюць, што пастаянна чамусьці вучацца. Іншая справа, калі бярэшся за гэта ў сталым узросце. Я з дзяцінства марыў стаць скульптарам, але дрэнна вучыўся ў школе і з тым атэстатам не мог паступіць, куды хачу. Мая першая спецыяльнасць «Маляр-тынкоўшчык». Я даволі доўга працаваў на будоўлі, але адчуванне, што можаш нешта большае, чым проста раўняць сцены, не пакідала. Жаданне рабіць нешта прыгожае памятаю за сабой яшчэ з дзіцячага садка. У мяне не было імкнення неяк самавыявіцца, проста хацелася рабіць тое, што прыносіць людзям радасць. У мастацкае вучылішча я паступіў толькі ў 25 гадоў.

***— Я чула, што калі чалавек атрымлівае творчую адукацыю ў больш сталым узросце, са сфарміраваным светапоглядам, ён можа больш узяць.***

— Вучыцца сапраўды было лёгка, я разумеў, што мне патрэбна. Але цікава назіраць і за моладдзю. Калі некаторых мастакоў не бачыш доўга, то адчуваеш, што сустракаеш родную душу. Мастакі адрозніваюцца ад іншых людзей, і гэта асаблівасць застаецца назаўсёды.

### ПРЫЗНАЧЭННЕ

***— Як нараджаецца любоў да прыгажосці? Яна прывіваецца ў сям'і, даецца звыш?***

— Мой бацька быў слесарам. Ён не меў творчай адукацыі, але займаўся і ювеліркай, і драўлянай скульптурай. Ён браў мяне ў лес, і там мы шукалі розныя цікавыя па форме фігуркі, вырашалі, на што яны падобныя. Яшчэ ён быў гравёрам. Калі памятаеце, як у ранейшыя часы кантралёры хадзілі са значкамі, дык першы такі значок зрабіў мой бацька. Маці — інжынер-канструктар, але яна марыла некалі паступіць вучыцца на архітэктара. Мая малодшая дачка вырашыла стаць мастаком — сёлета паступіла ў гімназію-каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка. Відаць, у нашым родзе ёсць такое прызванне. Неяк я размаўляў з азербайджанцам, і той мне расказаў, што ў яго вёсцы вераць, што чалавеку ўжо з маленства даецца прызначэнне. Ён нараджаецца з пэўнымі схільнасцямі да таго ці іншага занятку.



### У ПОШУКУ ВЫТОКАЎ

***— Шлях да храма дапамог вам лепш зразумець сябе і наогул вызначыцца ў прызначэнні мастацтва?***

— Гэта так, і я рады, што сёння ў Акадэміі навук працую ў фондах, дзе магу бачыць творы сакральнага мастацтва, якія ствараліся на нашай зямлі. Прычым іх рабілі не нейкія вядомыя мастакі, а простыя людзі. Шмат узораў наіўнага мастацтва. Калі гэтыя работы бачыш паасобку — адна справа, іншая — калі яны сабраны разам. Заўважаеш, што ёсць нейкія крытэрыі мастацтва, якія яшчэ трэба вывучаць. Тут можа не быць такіх вытанчаных формаў і ліній, але ёсць любоў. Людзі адчувалі прыгажосць. Перадавалі яе нават у дыванах. У чалавека, які займаўся мастацтвам у вёсцы, не было абмежаванняў. Ён не задумваўся, ці атрымаецца ў яго так, як у знакамітага мастака. Сёння многія работы патрэбна закансерваваць. Напрыклад, драўляныя скульптуры дайшлі да нас у дрэннай захаванасці. Аўтэнтычныя творы хочацца захаваць як ёсць, нічога не дадаваць. А на аснове іх стварыць дакладныя копіі з тымі ж матэрыяламі, фарбамі, каб людзі пабачылі, як усё гэта выглядала 100—200 гадоў таму. І ў прафесійных майстэрнях, і ў вясковых мастакоў былі свае асаблівасці. Вывучаючы іх тэхналогіі, якія ўплывалі на мастацкія формы, можна многаму навучыцца. Знаёмства з такімі работамі будзе вельмі карысным для тых, хто займаецца мастацкай адукацыяй. Немагчыма развівацца, калі не ведаць вытокаў.

***— Ці можна сказаць, што такое мастацтва дазваляе захоўваць ідэнтычнасць, прасочваць у тым ліку, як развіваўся чалавек, яго ўспрыманне свету, Бога, прага да мастацтва?***

— Сапраўды. Гэта асаблівая мова. Можна адчуць, пра што думаў чалавек 200 гадоў таму, нават калі проста капіруеш яго работу. Гэта гісторыя, запісаная ў фарбах, формах. Думаю, што нават у старажытным наскальным жывапісе можна адчуць душу чалавека. Рэстаўрацыя сама па сабе — толькі малая частка з усёй той работы, якую трэба зрабіць, аднаўляючы не толькі творы, але і думаючы пра рэстаўрацыю памяці, гісторыі. Многія прабелы яшчэ трэба прыбраць, нават каб лепш зразумець, што мы за народ, што закладзена папярэднікамі.

***— Вы працуеце над скульптурай Андрэя Багалюбскага, а днямі ў Томску быў урачыста адкрыты помнік праведнаму Фёдару Томскаму. Ці складана вам было працаваць над вобразам старца, які жыў у іншым часе?***

— З аднаго боку, нават працэй паказваць гістарычныя фігуры, у якіх жыццё ўжо адбылося, чым ствараць вобраз сучасніка. А тут асоба вельмі цікавая. Гэта кананізаваны святы. Ходзяць легенды, быццам гэта быў імператар Аляксандр Першы, які інсцэніраваў сваю смерць, што дазволіла яму знікнуць. Фёдар Томскі паказаны ў малітвенным парыве з сумой на плячах. Гэта чалавек, які абраў свой шлях. Калі я ляпіў скульптуру для Томска, калегі з Акадэміі навук мне падказвалі, якімі маглі быць вопратка, паскі... Яна Булат расказала, які быў абутак. Ён называўся «поршні». Адразу цікава, адкуль пайшоў выраз «варушы поршнямі», аказваецца, ён звязаны з абуткам, а не з рухавіком. Заўважыў, што такія дэталі сёння вельмі цікавыя моладзі. А колькі ўсяго яшчэ не ведаюць мастацтвазнаўцы, даследчыкі!

***— Зразумела, што дзякуючы скульптурам можна вяртаць гісторыю, ажыўляць мясцовыя легенды. У дадатак яны паслужаць і як турыстычныя аб'екты. А ці могуць скульптуры на рэлігійную тэму быць яшчэ і сімваламі альбо ўплываць на людзей, каб тыя станавіліся лепшымі?***

— Мая праца — гэта служэнне. Я імкнуся яе рабіць з добрымі думкамі. Нават калі нехта жадае іншаму, каб усё было добра, гэта ўжо як малітва за чалавека. Думаю, што вучоныя яшчэ будуць вывучаць уласцівасці чалавечай душы. І давайце не забываць на словы Дастаеўскага, што прыгажосць выратуе свет.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельного участка в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом с инв. № 254/U-12418 (срок консервации истек), наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (площадь застройки 96 кв. м, степень готовности 12 %, фундамент – бетон) и земельный участок с кадастровым № 223350100001002178 площадью 0,0763 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Тихая, 19.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом / зем. участок): **10701,85** (5696,57/5005,28) бел. руб. **Задаток: 1786,52** бел. руб. Удельный вес стоимости незавершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 53,23 %.

**Лот № 2.** Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом с инв. № 254/U-12130 (срок консервации истек), наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (площадь застройки 64 кв. м, степень готовности 12 %, фундамент – бетон) и земельный участок с кадастровым № 223350100001002011 площадью 0,1168 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Тихая, 13.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): 11670,78 (4008,70/7662,08) бел. руб. Задаток: 1786,52 бел. руб. Удельный вес стоимости незавершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 34,35 %

**Дата, время и место проведения аукциона: 23.08.2024 в 11.00** по адресу: 211287, Витебская обл., Миорский р-н, г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 24.05.2024 до 15.00 22.08.2024. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с: BY27 AKBB 3642 3210 0001 8210 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300071397, получатель платежа: Миорский райисполком.**

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника:** в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок, а также за уточнением целевого назначения земельного участка в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона публичных торгов (аукциона) либо после признания публичных торгов (аукциона) несостоявшимися в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство жилого дома; разработать проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий шесть месяцев; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство в сроки, установленные действующим законодательством.

**Назначение зем. участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.** Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность; представителем гражданина Республики Беларусь – доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников в отношении предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, (029) 533-72-81.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Мостовдрев». 231592, Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Советская, д. 38, тел.: +375 1515 6-46-15, +375 29 283-72-19.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 250/D-29836 площадью 2593,2 кв. м наименование – помещение производственного корпуса, назначение – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2. Изолированное помещение с инв. № 250/D-29837 площадью 1656,7 кв. м, наименование – помещение бытового корпуса, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2. Изолированные помещения с инв. № 250/D-29836 и с инв. № 250/D-29837 находятся в кап. строении с инв. № 250/C-20947 (наименование – производственный и бытовой корпус) по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2. Кап. строение с инв. № 250/C-26871 площадью 108,4 кв. м, наименование – здание склада ГСМ, назначение – здание специлизированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, по адресу: Витебская область, Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2. Кап. строение с инв. № 250/C-26637 площадью 13,4 кв. м, наименование – автозаправочная станция, назначение – здание специлизированное автомобильного транспорта, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2. Кап. строение с инв. № 250/C-42983 наружной площадью – 156 кв. м, наименование – навес, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, в районе ул. Строительной, 2. Кап. строение с инв. № 250/C-344467 площадью 13641,4 кв. м, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение неустановленного назначения, составные части и принадлежности: дорожное покрытие, забор-ограждение (трое ворот, калитка) по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2/4. Капитальные строения находятся на земельном участке с кадастровым № 243500000006000036 площадью 3,0076 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Строительная, 2 (право постоянного пользования, доля 1/1), целевое назначение земельного участка: использование под производственную базу и административное здание.

